ЦАНА НУМАРУ—5 КАП.

УМОВЫ ПАДПІСКІ (з дармовым дадаткам „Прафрух“)

На 1 мес. . . — 90 к.
„ 3 мес. . . 2 р. 60 к.
„ 6 мес. . . 5 р. —
„ 12 мес. . . 9 р. 75 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ

За радок нонп. пасьля тэксту—60 к., іншагародняя абвесткі—1 р. за радок. Пасярод тэксту—у два разы дарожэй. Пры шматразовым друкаваньні—скідка. Зьмін тарыфу згодна пастановы СНК ад 10-IX—24 г. бярэцца 10 проц. -ваддатку.

Падпіска і абвесткі прымаюцца ў гал. канторы газ. „Зьвязда“ Менск, Савецкая, 63, 3-ці паверх, тэл. 7-81.

ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЮ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі і Менскага АК КП(б)Б

ТЭЛЕФОНЫ:

Рэдактар	10-74
Сакратар	6-19
Партсэктар	13-80
Сэктар інфармацыі	13-80
Начны рэдактар	6-42
Галоўная кантора	7-81
Адзел падпіскі	7-81
» абвестак	7-81

ПЯТНІЦА, 14 сакавіка 1930 г. № 61 (3569) Год выданьня — XIV.

РЭДАКЦЫЯ І ГАЛОЎНАЯ КАНТОРА МЕНСК, Савецкая, 63.

Выправім памылкі, узмоцнім і разгорнем будаўніцтва калгасаў

Асобныя выступленьні на ўсебеларускай канфэрэнцыі батрацка бяднацкіх груп, а таксама рад паведамленьняў з месц сыгналізуюць, што частка актыўных работнікаў, партыйных і беспартыйных, няправільна ўявіла апошнія паказаньні партыі ў пытаньнях калгаснага руху, разглядаючы іх, як адступленьне.

Да чаго-ж зводзіліся гэтыя паказаньні.

Артыкул тав. Сталіна і пастановы партыйных органаў падагульваюць практыку шматмільённых сялянскіх мас у будаўніцтве сацыялістычнай сельскай гаспадаркі. Апіраючыся на гэту практыку, якая сьведчыць, што пераважная большасьць калгасаў ствараецца ў форме сельска - гаспадарчых арцеляй, — партыя высоўвае арцель, як пераважную, асноўную форму калгасу. Далей, партыя цьвёрда сказала, што яе палітыка ў вёсцы «апіраецца на добраахвотнасьць калгаснага руху і ўлік рознастайнасьці ўмоў у розных раёнах СССР». Ці магчыма добраахвотнасьць уступленьня ў калгас расцэньваць, як «адступленьне» партыі з заваяваных пазыцый, як адмаўленьне ад нейкіх дасягненьняў? Відавочна, не. Апошнія паказаньні партыі не зьмяняюць асноўнай устаноўкі нашай работы ў вёсцы, а накіраваны на зьнічэньне тых перагібаў і скажэньняў, якіх, на жаль, ёсьць досыць многа. Каб ня быць галаслоўнымі, падамо прыклад правядзеньня калектывізацыі ў сяле Сталішчы, Лельчыцкага раёну, Мазырскае акругі. «Калектывізатары» з Стадоліч абагульвалі насельне і нават будынкі сялян, якія не ўвайшлі ў калгас, правялі зямляўпарадкаваньне, замацаваўшы ўсю зямлю за калгасам, награжаючы сялянам,не жадаючым уступіць у калгас, высяленьнем на балоты, высылкаю ў тундру, у Салаўкі і г. д.

Бясспрэчна, што ў падобных выпадках мы маем справу з грубым, злачынным скажэньнем лініі партыі. Ня дзіва, адпак, што сяму-таму з стадаліпчанскіх калектывізатараў здаліся «адступленьнем» і нават «зрывам калектывізацыі» мерапрыемствы акруговых партыйных і савецкіх органаў па выпраўленьні злачынных мэтадаў калектывізацыі, якія ўжываліся ў Стадолішчах.

Абвяшчаючы арцель, як асноўную форму калгаснага руху і добраахвотнасьць, як кіруючы пачатак будаўніцтва калгасаў, партыя не адступае, ня б'е адбою, не здае ніякіх пазыцый. Партыя працягвае кіраваць, разгортваць, падтрымліваць калгасны рух. Партыя б'е па галавацянах, па скрыўленьнях і перагібах, па злачынным скажэньні лініі партыі. «Нельга насаджваць калгасы сілай» (Сталін).

Палітычна, у новай форме, стасоўна да новай абстаноўкі, створаная шпаркім ростам калгаснага руху, перад намі стаіць пытаньне аб серадняку. Серадняк у масе сваёй пашоў у калгасы. Гэта ня выключае некаторых хістаньняў і сумненьняў у асобных праслойках серадняцкае часткі вёскі. Перамагчы гэтыя асобныя хістаньні і сумненьні нельга ні сілаю, ні націскам. Жыцьцё, практыка, растлумачэньне, прыклад правільна пастаўленае калектыўнае гаспадаркі, довад на справе пераважнасьці буйное гаспадаркі — вось што зьнішчыць апошнюю рэшту сумненьняў і хістаньняў у пааасобных праслойках серадняцкай часткі вёскі.

Выходзячы з гэтых агульных прадпасылак, вырашаецца і трэцяе пытаньне, пастаўленае апошнімі паказаньнямі партыі. Гэта так званае пытаньне аб адній карове. «У аднакароўных гаспадарках малочная жывёла не абагульваецца. У шматкароўных гаспадарках застаецца ў індывідуальным карыстаньні адна карова, рэшта абагульваецца» — так гаворыць прыкладны статут сельска-гаспадарчай арцелі. Запытаньне, як-жа быць у тых калгасах, дзе ўжо правядзена поўнае абагуленьне рагатай жывёлы? Адказ на гэтае пытаньне дадзены ўжо ў гутарцы наркамзему СССР тав. Якаўлева з калгасьнікамі. «Там, дзе калектывізацыя праводзілася з перагібамі, з парушэньнем партыйнай лініі, дзе пры правядзеньні калектывізацыі былі дапушчаны адміністраваньне і прымус, зусім бясспрэчна, што частка сялян, членаў калектываў, на падставе статуту, пастановіць захаваць прыватную ўласнасьць на адну карову, — гаворыць тав. Якаўлеў. — Трэба выправіць дапушчаныя памылкі і ажыцьцявіць у арцелях поўнасьцю новы статут, вярнуць калгасьнікам у індывідуальнае карыстаньне кароў, дробную жывёлу, птушку, **калі гэтага патрабуюць самі калгасьнікі».**

Такая пастаноўка пытаньня не выключае магчымасьці захаваць у арцелях поўнае абагуленьне буйное рагатае жывёлы там, дзе гэта абагуленьне праведзена **добраахвотна** самімі калгасьнікамі, дзе створаны неабходныя ўмовы для ўтрыманьня жывёлы (ацепленыя хлявы, правільны догляд і кармленьне, неабходны запас кармоў), дзе адлегласьць і інш. мясцовыя ўмовы не ствараюць нявыгад у доглядзе за жывёлаю. Там, дзе былі перагібы, дзе поўнае абагуленьне малочнай жывёлы не адпавядае інтарэсам калгасьнікаў і гаспадарча не падрыхтавана, там, дзе самі калгасьнікі гэтага патрабуюць, трэба выправіць зробленыя памылкі, г. ё. вярнуць у індывідуальнае карыстаньне няправільна абагуленых кароў, сьвіней і інш.

Адступленьня, як бачым, няма і ў гэтым пытаньні. Яно вырашаецца, выходзячы з асноўнага кіруючага прынцыпу калгаснага руху — добраахвотнасьці.

Такія агульныя кіраўнічыя паказаньні партыі ў пытаньнях калгаснага руху. Трэба з усёй энэргіяй і рашучасьцю ўдарыць на скажэньнях партыйнай лініі ў вёсцы. Трэба пакончыць са зьбянтэжанасьцю і размовамі аб адступленьні. Выпраўленьне памылак і галавацяпства, правааапартуністычных ухіленьняў і загібаў, якія здаюцца «левымі», а па сутнасьці-ж, якія «льлюць ваду на млын правага апартунізму» ніколі яшчэ не разглядалася ў бальшавіцкай партыі, як здача пазыцый.

Партыйныя арганізацыі, савецкі актыў, батрацтва і беднота павінны стаць на чале ажыцьцяўленьня новага статуту. Некаторыя работнікі сьвядома тармозяць справу пераводу калгасаў на новы статут. Вынікам гэтага зьяўляюцца асобныя выпадкі самавольнага, анархічнага разбору калгасьнікамі абагуленае малочнае жывёлы.

Нельга забываць, што асноўнае, галоўнае ў сучасны момант — гэта найхутчэйшае абагуленьне асноўных сродкаў вытворчасьці. Ня дробная жывёла, не непрадукцыйная малочная карова, а сельска - гаспадарчыя прылады, конь і таварна - прадукцыйная жывёла вырашаюць лёс сельска - гаспадарчай кампаніі. Не раскідвацца, не хапацца за ўсё і забываць найбольш важнае.

І якраз у гэтым важнейшым пытаньні падрыхтоўкі да веснавой сяўбы мы маем найбольшае адставаньне. Арганізацыя працы ў калгасах, як правіла, не пачата. Ссылка насельня ў калгасах яшчэ ня скончана. Абагуленьне рабочай жывёлы праведзена ўсяго толькі на 37 проц. Складаньне вытворчых плянаў, разьбіўка палёў, зямляўпарадкаваньне калгасаў вядуцца недапушчальна марудным тэмпам. Калгасы, якія ня выканаюць у тэрмін гэтых задач, застануцца папяровымі калгасамі. Неабходна ўзьняць і ўзмацніць работу сярод батрацтва і беднаты, што зьяўляецца рашаючым фактарам далейшага разгортваньня калгаснага руху і ўзмацненьня існуючых калгасаў.

Гэтыя задачы зьяўляюцца першачарговымі. У гэтым зараз цэнтр цяжару работы.

К. ГЕЙ.

ДА СЯЎБЫ ЗАСТАЛІСЯ ЛІЧАНЫЯ ДНІ

Многія калгасы і саўгасы не падрыхтаваны да палявых работ

Стварэньне кармавых фондаў у калгасах—адна з важнейшых задач

Самаашуканства і „очковтирательство“

Брагінскі раён, Гомельская акругі, — адзін з самых эканамічна моцных раёнаў Гомельскай акругі. Гэта найлепшы збожжавы раён ня толькі ў Гомельшчыне, але бадай што ва ўсёй БССР. Два месяцы назад Брагінскія раённыя арганізацыі абвясьцілі свой раён раёнам суцэльнае калектывізацыі. Гэта было зроблена ў той час, калі лішча раёну была калектывізавана ня больш, чым на 25-30 проц.

Узяўшы на сябе такую адказьнейшую задачу, цэнтр раёну ня ўлічыў сваіх сіл, усёй складанасьці і цяжкасьці поўнай калектывізацыі раёну да веснавой сяўбы. Але, наколькі суцэльная калектывізацыя была абвешчана, дык здавалася, што трэба было-б разгарнуць сапраўды бальшавіцкі тэмп работы ўсім партыйным, савецкім і грамадзкім арганізацыям.

На справе было зусім інакш. На працягу двух апошніх месяцаў і раённыя і сельскія арганізацыі выяўляюць амаль поўную бязьдзейнасьць як у справе падрыхтоўкі да сяўбы, так і замацаваньня арганізаваных калгасаў. Наглядаецца ганебная абломаўшчына, злачынная непаваротлівасьць, адсутнасьць усякай адказнасьці ў рабоце, злачыннае і сьвядомае «очковтирательство» вышэйшых устаноў і грамадзкасьці.

Тое становішча, якое зараз стварылася ў Брагінскім раёне, калі прыняць пад увагу, што да пачатку сяўбы засталіся лічаныя дні, гаворыць аб тым, што веснавая сельска - гаспадарчая кампанія і калектывізацыя знаходзяцца тут пад самай рэальнай пагрозай поўнага зрыву.

Пяройдзем да фактаў.

У арганізаваных 43-х калгасах насенныя фонды яравых культур ссыпаны толькі на 50 проц., а бульбы — на 56 проц. Нават у старых калгасах яшчэ цалкам ня створаны насенныя фонды. Замест таго, каб сканцэнтраваць усю увагу калгасьнікаў на гэтай важнейшай задачы, мясцовыя і раённыя арганізацыі займаліся самаашуканствам і ашуканьнем акруговых органаў, паказваючы яўна няправільныя лічбы ў дэкадных зводках. У той час, як неабходна было стварыць насенны фонд у разьмеры 10.975 цэнтнэраў (і аб гэтым ведаў раён). даюцца весткі, што ён павінен складаць толькі 5.515 цэнтнэраў.

Тое самае «очковтирательство» назіраецца і пры ажыцьцяўленьні іншых мерапрыемстваў. У апошняй дэкадной зводцы, напрыклад, гаворыцца, што «коняй абагулена 3.150, маладняка — 768, кароў — 3.058, маладняка — 850, сьвіней—3.162, авец — 1.170, а ўсяго разам абагулена 12.758 галоў». Не гаворачы ўжо аб тым, что невядома якіх гэта кароў, сьвіней і авец абагульваюць, трэба адзначыць, што ўся гэта зводка зьяўляецца проста ашуканствам, бо ў сапраўднасьці раён... нават не ўяўляе сабе, што і дзе канкрэтна робіцца ў гэтай галіне. Літаральна, ні адзін з раённых працаўнікоў ня можа назваць поўнай лічбы аб абагуленьні. Зводка складзена на падставе лічбаў, узятых са столі, толькі-б адчапіцца ад акруговага цэнтру, які патрабуе іх.

З даных, якія я атрымаў непасрэдна з калгасаў, відаць, што большасьць з іх не прыступіла нават да абагуленьня рабочае скаціны. Тыя асобныя калгасы, якія часткова і абагулілі коняй, не стварылі і не ствараюць пакуль што патрэбных фуражных фондаў.

Між іншым, зводка Брагінскага раёну аб абагуленьні жывёлы ўсё-ж мае паўную «падставу». «Падстава» гэта сьведчыць аб тым, што ў справе абагуленьня жывёлы ў Брагінскім раёне было дапушчана абураючае скрыўленьне партыйнае лініі. Аказваецца, што кі па 5-ці калгасах. Такі марудны тэмп працы зямляўпарадкаваньня тлумачыцца тым, што на іх усклалі абавязак... агітаваць па калгасы. Карацей кажучы, зямляўпарадчыкаў накіравалі не ў калгасы для правядзеньня там зямляўпарадкаваньня, а ў сельсаветы, якія яшчэ не калектывізаваны, дзеля таго, каб яны іх калектывізавалі. У выніку гэтага зямляўпарадчыкі 10 проц. часу трацяць на зямляўпарадкаваньне, а 90 проц. на агітацыю за калектывізацыю.

Абагульваньне насеньня ў калгасе «ЭНГЕЛЬС».

Якія-ж вынікі такое працы брагінскіх партыйных і савецкіх арганізацый на суцэльнай калектывізацыі свайго раёну?

На 1-га сакавіка раён калектывізаваны на 59 проц., а па колькасьці гаспадарак толькі на 50. З 20-га лютага далейшая калектывізацыя амаль спынілася. Больш таго, з гэтага чысла ў радзе месц пачаўся працэс выхаду з калгасаў. Асноўная прычына такога зьявішча трэба лічыць тое, што калгасы не ўмацаваны, праца ў іх не арганізавана, асноўныя сродкі вытворчасьці не абагулены і, самае галоўнае, — поўная бязьдзейнасьць у галіне арганізацыі батрацтва і беднаты.

Нераскулачаныя кулакі і сэктанты вядуць шалёную антыкалгасную агітацыю, разбазарваюць жывёлу і не сустракаюць належнага адпору ні з боку партыйных, ні з боку савецкіх арганізацый.

Брагінскі райком КП(б)Б з вялікім спазьненьнем, толькі 6-га сакавіка, прызнаў, што «становішча работы па асноўных галінах падрыхтоўкі да веснавое кампаніі і калектывізацыі катастрафічнае». Райком канстатуе правалы і называе нават вінаватых (галоўным чынам стрэлачнікаў), але што ён рабіў і дзе быў раней. Нават цяпер ён не адважыўся зрабіць належных рашучых арганізацыйных вываладаў. Райком толькі прапануе РВК і райкалгассаюзу ўзмацніць працу, а не канстатуе, што іменна РВК і райкалгассаюз пры адсутнасьці належнага нагляду і кантролю з боку самога райкому зьяўляюцца галоўнымі вінаватымі ў правале.

Вывад напрошваецца сам сабою. Трэба неадкладна пракантраляваць працу ўсіх брагінскіх арганізацый, пераглядзець склад кіраўніцтва і апарату як партыйных, так і савецкіх органаў, прыцягнуць да партыйнай і савецкай адказнасьці злачынцаў і «очковтирателей»

Брыгадзір «Зьвязды» П. ПЯЧОНКА.

Саўгасы не падрыхтаваны да сяўбы

Вымова Белсельтрэсту

Мы стаімо зараз перад пачаткам веснавое сяўбы і ад посьпеху падрыхтоўкі да сяўбы сацыялістычнага сэктару залежыць ступень рэканструкцыі нашай сельскае гаспадаркі, замацаваньне калектыўных гаспадарак і паступальны ход усяго нашага гаспадарчага разьвіцьця. У поўным разуменьні ўсёй вялізнай важнасьці і значэньня веснавое пасеўнае кампаніі мы павінны з напруджанай увагаю сачыць за ходам падрыхтоўкі да сяўбы па ўсім сельска-гаспадарчым фронце — нам надзвычай важна, каб і тут ня было прарэхаў, ня было прарываў. І асабліва суровыя запатрабаваньні мы тут прад'яўляем да саўгасаў, як дзяржаўных гаспадарак, якія ўжо ўстанавіліся і маюць арганізацыйную практыку. Савецкія гаспадаркі павінны ісьці ўперадзе сельскае гаспадаркі, як гаспадаркі паказальныя, і агрыкультурна ўзьдзейнічаць на повыя калектыўныя гаспадаркі, якія яшчэ не ўстанавіліся і не замацаваліся.

І таму нас вельмі зьдзіўляе і абурае, калі мы даведаліся, што нашы саўгасы і Белсельтрэст, які іх аб'ядноўвае, зусім кепска падрыхтаваліся да сяўбы— прарэхі тут відны на кожным кроку.

Аўстыка насеннага матар'ялу па саўгасах далёка яшчэ ня скончана, і ўстаноўленыя ўрадам тэрміны даўно прапушчаны. Рамонт сельска-гаспадарчых машын і трактараў яшчэ далёка ня скончаны. Па саўгасах налічваецца да 60 хворых трактараў, і яны адрамантаваны толькі на 40-50 проц. Ня гледзячы на прапанову Наркамзему (якая была дана яшчэ ў студзені) дагаварыцца з Жлобінскаю і Гомельскаю чыгуначнымі майстэрнямі аб рамонце трактараў—дагаворы заключаны толькі нядаўна.

Дырэктыва аб пашырэньні саўгасаў да гэтага часу яшчэ не праведзена ў жыцьцё, і саўгасы на мясцох ня ведаюць якую плошчу—старую або пашыраную—ім трэба засяваць. Нават і сам Белсельтрэст ня ведае разьмеру адведзенай пад узбуйненыя саўгасы зямлі, лічбы патрэбнага насеньня, рабочай і цягавай сілы.

У Белсельтрэсьце амаль што зусім адсутнічаюць весткі аб ходзе падрыхтоўчай работы да пасеўнай кампаніі ў саўгасах, апэрацыйныя дэкадныя зводкі не складаюцца, прычыны кіраўнікі трэсту даюць такое тлумачэньне: «не атрымоўваем вестак з месц — што-ж ты зробіш?» Такое тлумачэньне гаворыць само за сябе і дрэнна рэкамэндуе кіраўніцтва Белсельтрэстам. Як, калі не ганебным, трэба расцаніць той факт, што дырэктар Белсельтрэсту тав. Грабенчык па заданае яму пытаньне (на пасяджэньні калегіі Наркамзему) аб колькасьці заезэнага для патраб саўгасаў угнаеньня, адказаў ніведаньнем...

Рабочыя саўгасаў амаль што зусім ня ўцягнуты ў абмеркаваньне вытворчых і пасеўных плянаў—і ў гэтым мы бачым асноўную бяду, галоўную прычыну такой бязьдзейнасьці і безадказнасьці адміністрацыі саўгасаў. Адсутнасьць сапраўднага рабочага кантролю мела кепскі ўплыў на адміністрацыйны пэрсанал.

Наркамзем зараз забіў трывогу (трэба сказаць, з некаторым спазьненьнем) з повану становішча, якое стварылася—Белсельтрасту абвешчана наўторная вымова за кепскую падрыхтоўчую работу, запатрабаваны сьпісы загадчыкаў саўгасаў і акруговых упоўнаважаных для прыцягненьня іх да адказнасьці за зрыў раду мерапрыемстваў па пасеўнай кампаніі. Трэба мерка-ваць, што гэтыя суровыя, але спраўядлівыя, рэпрэсыўныя меры Наркамзему будуць мець свой уплыў і прымусяць разварушыцца адміністрацыйны пэрсанал як Белсельтрасту, так і пасобных калгасаў. Але гэтага мала— неабходна ўсіляким спосабам разварушыць масы саўгаскіх рабочых, каб яны ўзьнялі сваю актыўнасьць і ўзялі пад пільны нагляд усю работу саўгаскай адміністрацыі—толькі такое мерапрыемства можа аздаравіць і выправіць усе зрывы падрыхтоўчай работы да сяўбы. Саўгасы павінны апраўдаць укладзеную на іх ролю ў сельскай гаспадарцы.

П. Н.

Украінская контр-рэвалюцыя перад пралетарскім судом

Допыт падсуднага Яфрэмава

РАСПРОДАЖ УКРАІНЫ ПА ЧАСЬЦЯХ ЗАМЕЖНАМУ КАПІТАЛУ,—ЗВАРОТ ПОЛЬСКІМ ПАМЕШЧЫКАМ І КАПІТАЛІСТЫМ ІХ МАЕНТКАЎ,—ВЫПЛАТА 5 МІЛЬЯРДАЎ ДАЎГОЎ ЦАРСКАЕ РАСІІ ФРАНЦЫІ, АНГЛІІ І ІНШ. ДРАПЕЖНІКАМ,—РЭСТАВРАЦЫЯ СТАРАДАЎНЯГА ПОЛЬСКА-ШЛЯХОЦКАГА ПАНАВАНЬНЯ НАД УКРАІНСКІМІ ПРАЦОЎНЫМІ МАСАМІ З ПАВАРОТАМ ІХ У СТАН БЫДЛА—ВОСЬ ДА ЧАГО ІМКНУЎСЯ «СВУ». ЦЕСНАЯ СУВЯЗЬ ПАМІЖ «СВУ» І ПОЛЬСКАЮ ВАЙСКОВАЮ КОНТР-РАЗЬВЕДКАЮ.

ХАРКАЎ, 12. На працэсе па справе «Саюзнага бюро Украіны» скончылі пытаньне акту абвінавачаньня.

Пасьля зачытаньня акту абвінавачаньня суд распачаў допыт абвінавачаных. На запытаньне суду, ці прызнае Яфрэмаў правільным абвінавачаньне, той адказвае станоўча. **34 абвінавачаных прызналі сваю віну без агаворак, 10 абвінавачаных заявілі, што прызнаюць сябе вінаватымі часткова.**

На запытаньне пракурора, якую мэту ставіў сабе «СВУ», Яфрэмаў адказвае: «Вызваленьне Украіны з-пад савецкай улады і заснаваньне незалежнай украінскай рэспублікі».

Калі пракурор пераходзіць да пытаньня аб тактыцы арганізацыі, дык Яфрэмаў упарта стараецца запэўніць суд у тым, што саюз у сваёй контррэвалюцыйнай дзейнасьці галоўным чынам спадзяваўся на «перараджэньне савецкай улады на Украіне», на тое, што савецкая ўлада ня здолее выканаць усіх абяцаньняў, якія яна дала працоўным. Яфрэмаў хоча запэўніць, што ня было выразнай устаноўкі на паўстаньне, а былі толькі тэарэтычныя разважаньні. Паўстаньне-ж, як спасаб барацьбы з савецкаю ўладаю толькі «не адхілялася».

Пракурор прыпамінае падсуднаму аб сувязі Яфрэмава з паўстанцкімі атаманамі. Яфрэмаў заяўляе, што ў мінулым ім меў шчыльную сувязь з бандыцкімі атаманамі, падпольнымі паўстанцкімі арганізацыямі, спачуваў іх дзейнасьці, даваў парады, але... ня даваў веры посьпеху паўстанцкай барацьбе з савецкай уладаю.

На запытаньне пракурора, як адносіўся сам Яфрэмаў да тэрарыстычных замахаў на савецкіх прадстаўнікоў за мяжою, Яфрэмаў адказвае: «Ён іх не ўхваляў». Пракурор зачытвае паказаньні Яфрэмава на папярэднім дазнаньні, з якіх відаць, што Яфрэмаў, як прызнаў ён, пасьля забойства Войкава ў Варшаве даваў маральную санкцыю на тэрарыстычныя акты супроць прадстаўнікоў савецкай улады.

Допыт Яфрэмава пераходзіць далей на грамадзкага абвінаваўцы, прадстаўніка Усеукраінскага савету прафсаюзаў тав. Любчанка. Яфрэмаў, адказваючы на запытаньні тав. Любчанкі, прымушае прызнаць, што пад барацьбою за незалежнасьць Украіны сацыялістыя - фэдэралісты, лідэрам якіх зьяўляўся Яфрэмаў, разумелі антыўную барацьбу супроць савецкай улады пры дапамозе, пятлюраўскага войска, так і беларускай арміі Дзянікіна, Краснова і інш.

ХАРКАЎ, 13. На працэсе «СВУ» вечарам 11 сакавіка з вялікай зацікаўленасьцю прайшоў допыт абвінавачанага Яфрэмава грамадзкім абвінаваўцам т. Любчанкам. З допыту высьвятляецца, што незалежнасьць Украіны была для Яфрэмава ўсяе партыі сацыялістых-фэдэралістых толькі прыкрыцьцем для барацьбы з савецкай уладай. Тав. Любчанка задае пытаньне Яфрэмаву, як ён адносіўся да незалежнасьці Украіны.

Яфрэмаў: — Мы стаялі за незалежнасьць Украінскай рэспублікі.

Тав. **Любчанка:** Ад каго?

Яфрэмаў: «Ні ад каго. Ад усіх незалежна». (У залі сьмех). Тав. Любчанка прыпамінае, што Яфрэмаў пісаў прыблізна наступнае: «Калі там, г. зн. у Расіі, будуць не бальшавікі, дык мы за фэдэрацыю, а калі будуць бальшавікі, дык мы за незалежнасьць».

Тав. **Любчанка** ставіць Яфрэмаву пытаньне:—Вы віталі ўступленьне Пятлюры ў Кіеў у 1920 годзе? Яфрэмаў прымушаны гэта пацьвердзіць. «Урачыстая сустрэча Пятлюры — гаворыць тав. Любчанка — бессаромнае яднаньне сацыялістых - фэдэралістых з пятлюраўцамі і польскім ваенным камандаваньнем даволі выразна характарызуе сапраўдныя адносіны Яфрэмава і ўсіх яго паплечнікаў да польска - пятлюраўскай прыязьні, да варшаўскага дагавору, заключанага паміж Польшчай і Пятлюрай. На падставе гэтага дагавору **Пятлюра прызнаў права Польшчы на граніцы 1772 году і аддаваў Польшчы Заходнюю Украіну».**

Яфрэмаў з пачатку заявіў, быццам ён нават ня бачыў гэтага дагавору, але бачачы, што такі адказ зьяўляецца сьмешным, Яфрэмаў гаворыць: «Я прыпцыпова быў супроць гэтага, але іншага выхаду ня было. Гэта была адна з камбінацый».

Тав. Любчанка пытаецца:

«Ці ня лічыце вы, што варшаўскі дагавор і зроблены продаж Украіны ня зусім адпавядае праграме «СВУ» аб незалежнасьці?»

Яфрэмаў з гэтым згаджаецца.

Тады грамадзкі абвінаваўца яму пры памінае, што **пятлюраўскі ўрад адрокся ад Буковіны і Бэсарабіі на карысьць Румыніі.**

Тав. Любчанка **допытам і дакументальна ўстанаўляе, што партыя сацыялістых - фэдэралістых вітала нямецкую акупацыю Украіны. Тав. Любчанка агалашае далей рад дакумантаў, якія сьведчаць аб сувязі і дагаворах ураду УНР з панскай Польшчай.**

Яфрэмаў на ўсё гэта заяўляе, што ён нічога ня ведаў.

Тав. **Любчанка:**

Як павашаму, заключыўшы дагавор, які аддае ўсю Заходнюю Украіну, усе фабрыкі і заводы пад кантроль чужаземнага капіталу, адкрыў ваенную прамысловасьць... гэта ёсьць барацьба за незалежнасьць Украіны?

Яфрэмаў вымушан прызнаць, што гэта не барацьба за незалежнасьць.

Вялікае ўражаньне робіць агалошаны тав. Любчанка ліст Мацыевіча, які быў у 1920 годзе дыпляматычным прадстаўніком пятлюраўскага ўраду ў Румыніі. Мацыевіч, які зьяўляецца такімжа «барацьбітом» за незалежнасьць Украіны, як і падсудны Яфрэмаў, у гэтым лісьце пісаў:

«Мы, нацыя, такіх хамаў, якім патрэбны заграніцы пан. Хто ўгодна, толькі-б не свае».

Грамадзкі абвінаваўца тав. Любчанка спыняецца далей на пытаньні аб тым. як «СВУ» ўяўляў сабе вырашэньне **зямельнага пытаньня.** Яфрэмаў 10-га сакавіка на судзе зусім выразна заявіў, што праграма «СВУ» **прадугледжвала перадачу зямлі не былым уласьнікам і што сялянства павінна было плаціць памешчыкам за зямлю.**

Тав. Любчанка прыпамінае, што Кастрычніцкая рэвалюцыя перадала сялянам Украіны **12.200 тыс. гэкт. памешчыцкай зямлі** і пытаецца, ці ня можа падсудны сказаць, колькі мільярдаў даўгоў ляглo-б на плечы сялянства, калі-б «СВУ» ажыцьцявіў сваю зямельную праграму.

Яфрэмаў са штучнай наіўнасьцю прабуе намаляваць справу так, што плаціла-бы дзяржава, а таксама і памешчыкі. Тав. Любчанка наконт гэтага заўважае, што дзяржава сама трошай не нараджае, што **ўсё гэта ляглo-б на плечы не памешчыкаў, а сялян.**

Яфрэмаў прымушаны прызнаць, што **«СВУ» ў сваёй зямельнай палітыцы разьлічваў на падтрыманьне кулакоў.** Яфрэмаў пацьвярджае, што калі-б праграма «СВУ» перамагла, **то яны меркавалі выплаціць даўгі царскай Расіі Францыі, Англіі і іншым дзяржавам у суме да 5 мільярдаў.**

Тав. Любчанка шляхам розных цытат выяўляе, што **Яфрэмаў зьяўляецца яўным антысэмітам.**

Яфрэмаў прымушан далей прызнаць, што **вучоныя, члены «СВУ», выкарыстоўвалі савецкія камандыроўкі заграніцу для сувязі з контр-рэвалюцыйнымі дзеячамі украінскай эміграцыі.**

Закранаючы рэйс атамана Цюпоніка Яфрэмаў гаворыць, што ён падтрымліваў Цюпоніка, але ня ведаў, што той быў зьвязан з генэральным штабам замежнай дзяржавы.

Адносна гэтага тав. Любчанка задае Яфрэмаву запытаньне:

«Няўжо-ж вы думаеце, што можна фармаваць заграніцаю армію без дазволу адпаведнага генштабу?».

Яфрэмаў бездапаможна разводзіць рукамі.

Адначасова з гэтым выяўляецца, што **Яфрэмаў меў сувязь з начальнікам польскай ваеннай контр - разьведкі Юзэфсім і сустракаўся з ім у Акадэміі Навук.**

Буржуазія і сац.-фашыстыя ўхвалілі плян Юнга

БАРАЦЬБА СУПРОЦЬ ПЛЯНУ ЮНГА БУДЗЕ ВЫРАШАНА НА ВУЛІЦЫ

БЭРЛІН, 13. У рэйхстагу ў спрэчках аб пляне Юнга ў трэцім чытаньні прадстаўнікі ўсіх партый яшчэ раз паўтарылі свой пункт погляду на гэты плян. Выступіўшы ад фракцыі прадстаўнік нацыяналістых заявіў, што яго фракцыя ўнясе прапанову адкласьці ўступленьне ў моц закону аб пляне Юнга на два месяцы. Пры гэтым ён заклікае прэзыдэнта Гінденбурга яшчэ раз абмеркаваць, ці паставіць сваё імя пад такім дакумантам, як плян Юнга.

Камдэпутат Флорын заявіў, **што барацьба супроць пляну Юнга будзе вырашана не ў парляманце, а на вуліцы.**

Пасьля заканчэньня спрачак плян Юнга ў трэцім чытаньні быў прыняты большасьцю 276 галасоў супроць 192. Спрэчкі паказалі, што крытычнае становішча ўраду насугл мінавала пасьля таго, як партыя цэнтру пастанавіла падтрымаць фінансавыя патрабаваньні народнай партыі, відавочна, не жадаючы нават часова сфармаваць урад з цэнтру, дэмакратаў і сацыял-дэмакратаў.

* * *

БЭРЛІН, 12. У рэйхстагу апазыцыйныя партыі ўнесьлі прапанову аб адтэрміноўцы апублікаваньня закону, зьвязанага з прыняцьцем пляну Юнга. Супроць прапановы галасавала 298 дэпутатаў, за—173. Неабходная адна трэць галасоў для таго, каб патрабаваць апублікаваньня была такім чынам сабрана. Прэзыдэнт рэспублікі, ня гледзячы на выказанае аднэй трэцяй часткаю дэпутатаў жаданьне адтэрміноваць закон мае права апублікаваць яго, калі толькі рэйхстаг прызнае гэта апублікаваньне тэрміновым. Рэйхстаг прыняў пастанову аб прызнаньні апублікаваньня закону тэрміновым.

Зацьвярджэньне рэйхстагам польска-нямецкай ліквідацыйнай згоды

БЭРЛІН, 12. Большасьцю 236 галасоў супроць 217 рэйхстаг прыняў у трэцім чытаньні польска-нямецкую ліквідацыйную згоду.

Зьнікненьне архіву варшаўскай белагвардзейскай арганізацыі

ВАРШАВА, 12. Зьнік архіў варшаўскай белагвардзейскай арганізацыі. З поводу гэтага папярэджаюцца меркаваньні, што архіў украдзены з палітычных матываў. Белагвардзейская газэта «За Свабоду», зразумела, абвінавачвае ў зьнікненьні архіву «бальшавіцкіх агэнтаў».

ПАРАЖЭНЬНЕ ЎРАДУ МАКДАНАЛЬДА

Становішча ўраду катастрафічна пахіснулася

ЛЁНДАН. 11-га ўвечары у палаце вобшчын панавала вялікае ўзбудженьне ў сувязі з паражэньнем ураду, атрымаўшага пры галасаваньні папраўкі кансэрватараў да законапраекту аб вугальнай прамысловасьці 274 галасы супроць 282. Кансэрватары прапанавалі выключыць з законапраекту артыкул, які прадугледжвае ўвядзеньне падатку на вугаль, які рэалізуецца ўнутры краіны. Вынікі галасаваньня былі сустрэчаны бурнымі апляўдысмэнтамі з боку кансэрватараў і крыкамі: «У адстаўку». Дэпутаты рабочай партыі наладзілі контр - дэманстрацыю, таксама з шумнымі воплескамі.

Выступіўшы Макдональд заявіў, што прынятая палатай папраўка ня ўносіць істотных зьмен у законапраект і таму ўрад ня ідзе ў адстаўку і мяркуе прасіць палату вобшчын ня спыняць сваю работу. (ТАСС)

Вапнаваньне глебы зрываецца

Вапна, якая адгружаецца з **Добрушу** на месцы для вапнаваньня глебы, затрымліваецца на чыгуначных станцыях цэлымі тыднямі і больш. Такія выпадкі былі ва **Ўраравіцкім, Цэрахаўскім і Рэчыцкім** раёнах.

Райвыканкомы, райаграномы і райкалгассаюзы ня прымаюць ніякіх мер да таго, каб неадкладна забраць гэту вапну і разьвезьці яе па мясцох.

Па акрузе павінна быць заваншавана глеба 400.000 пудамі вапны. Апошняя ні ў якім выпадку не павінна залежвацца на станцыях, а неадкладна развозіцца па калгасах.

Не дапамагаюць

Даныя аб канкрэтнай дапамозе калектывізацыі з боку саўгасаў БССР сьведчаць, што яны вельмі мала аддаюць увагі гэтай адпэй з сваіх асноўных задач. Вынікі работы саўгасаў у гэтай галіне вельмі малыя. Вось канкрэтныя даныя.

Саўгасы павінны былі арганізаваць 480 вытворчых нарад у калгасах. Да гэтага-ж часу 143 саўгасы арганізавалі толькі 100 вытворчых нарад. Замест 1.800 вытворчых плянаў калгасам, імі складзены толькі 63.

Рабочыя брыгады на дапамогу калгасам яшчэ ня вылучаны ні ў адным саўгасе. З ліку 8.000 **курсантаў** - калгасьнікаў, якія павінны навучацца на курсах саўгасаў, навучаецца толькі 205. Складаючы вытворчыя пляны для калгасаў, саўгасы амаль ня сочаць за правядзеньнем іх у жыцьцё.

Дапамога калгасам абмяжоўваецца толькі правядзеньнем сходаў у іх і чытаньнем лекцый.

Яшчэ аб адным прарыве на літаратурным фронце

Правільная палітыка партыі на літаратурным фронце забяспечыла вялізарныя поспехі ў справе разьвіцьця пралетарскай літаратуры ў БССР, у справе кансалідацыі літаратурных сіл і выхаваньня новых кадраў пралетарскіх пісьменьнікаў. За апошнія гады значна вырасла і ўзмацнілася Беларуская Асацыяцыя Пралетарскіх Пісьменьнікаў, якая, пад кіраўніцтвам КП(б)Б, наступова завалёўвае камандныя вышыні ў галіне мастацкай літаратуры.

Але было-б вельмі небясьпечным, калі-б з-за гэтых посьпехаў мы не заўважвалі тых адмоўных зьявішч і працэсаў, якія маюць месца ў літаратурным асяродзішчы. Абвастраньне клясавай барацьбы, якое ідзе побач з посьпяховым разгортваньнем сацыялістычнага будаўніцтва, калгаснага руху і на базе яго ажыцьцяўленьня палітыкі ліквідацыі кулацтва, як класы, ня можа не знайсьці свайго адбітку і на літаратурным фронце. Клясавы вораг — кулак, нэпман, нацыянал - дэмакрат, шавіністы ўсякага колеру — аказвае шалёнае супраціўленьне сацыялістычнаму наступленьню на можным вучастку нашага будаўніцтва.

Усё гэта патрабуе ад усіх нашых арганізацый, і ў першую чаргу ад арганізацыі пралетарскіх пісьменьнікаў, асаблівай пільнасьці і ўвагі да ўсяго таго, што робіцца ў літаратурным асяродзішчы. Асабліва важнае значэньне набывае своячасовае рэагаваньне на кожны найменш прарыў у рабоце літаратурных арганізацый, рашучая барацьба з прасякненьнем у рады савецкіх пісьменьнікаў усялякіх непралетарскіх, антыпартыйных настроеў, мабілізацыя ўсёй масы пралетарскіх пісьменьнікаў для барацьбы з гэтымі шкодными настроямі.

Трэба проста сказаць, што далёка ня ўсімі ў літаратурным асяродзішчы, нават у асяродзішчы літаратурнага актыву, у належнай меры ўсьвядомлены тыя падспудныя працэсы, тыя зрухі, якія вакол іх адбываюцца. Всьць нават факты, што паасобныя кіраўнікі літаратурных арганізацый, ня толькі не заўважаюць і праходзяць міма тых адмоўных зьявішч і настроеў, якія прасякаюць у рады кіруемых імі арганізацый, але нават плятуцца ў хвасьце гэтых настроеў.

Яскравым прыкладам у гэтых адносінах можа служыць справа аб выключэньні з БДУ члена БелАПП Якіма Скрыгана (Відуна). Не ўваходзячы пакуль што ў ацэнку правільнасьці ці няправільнасьці выключэньня Скрыгана з БДУ, мы павінны, перш за ўсё, зьвярнуць увагу на тыя незадаровыя настроі, якія ў сувязі з гэтай справай выявіліся. Гэтыя настроі выявіліся ў тым, што сярод некаторай часткі членаў БелАПП найшлі, прыкладна, такія разважаньні: «што-ж, калі не пагадзіць і ня пытаюцца зусім БелАПП і выключаць, дык дзе-ж нам тады дзецца, хоць едзь куды: у Сібір, ці ў Донбас, ці ў Азію». Нам здаецца, што такія разважаньні асаблівых каментараў не патрабуюць. Гэткія разважаньні нельга інакш расцэньвацьі, як прадукт кулацкага ўплыву на паасобных найменш устойлівых адзінак з членаў БелАПП. Клясавую істоту і аснову гэткіх разважаньняў ніякімі размовамі аб памылковаасьці выключэньня Скрыгана з БДУ не замазаць. Дапусьцім нават, што выключэньне Скрыгана з БДУ зьяўляецца памылкай. Ці БелАПП ня мае магчымасьці праз адпаведныя арганізацыі дабіцца выпраўленьня гэтай памылкі? Ці можа выключэньне Якіі Скрыгана быць падставай для такіх лямантаў, быццам ужо і «дзецца няма куды»? І ці ня ясна, што за гэтым канчным лямантам хаваецца на сутнасьці найгыдзейшае недавер'е да палітыкі КП(б)Б наогул і ў прыватнасьці — у справе падрыхтоўкі кадраў пралетарскіх пісьменьнікаў? Нам здаецца, што двох адказаў на гэтае пытаньне быць ня можа. Разважаньні накшталт паданых вышэй, па сутнасьці, зьяўляюцца варожымі нашай партыі і яльлюць ваду на млын клясавага ворага, які ўсялякімі спосабамі імкнецца дыскрэдытаваць палітыку нашай партыі, сеяць недавер'е да яе ў шырокай масе працоўных.

Ня прыходзіцца, зразумела, і гаварыць аб тым, што падобныя разважаньні і настроі павінны сустрэць самы рашучы адпор з боку ўсёй пралетарскай грамадзкасьці і ў першую чаргу з боку самога БелАПП. На жаль, аднак, бюро Менскай філіі БелАПП, сярод членаў якое гэтыя разважаньні «гулялі» і якая павінна была ў першую чаргу «ўзяць у штыхі» гэтыя разважаньні, ня толькі не рэагавала на іх, але на сутнасьці паплялося ў хвасьце гэтых настроеў. Што гэта так, лепш за ўсё гаворыць прынятая бюро Менскай філіі пастанова з поваду выключэньня Скрыгана з БДУ. У гэтай пастанове мы знаходзім наступнае:

> «5. З свайго боку бюро Мен. філіі БелАПП, ведаючы настроі большасьці членаў філіі, лічыць ненармальным ігнараваньне прадстаўніка БелАПП'у вылучанага для ўдзелу ў вырашэньні гэтага пытаньня (аб Скрыгану), — грамадзкімі арганізацыямі БДУ, у прыватнасьці прафкомам падфаку».
>
> «6. З прычыны таго, што выпадак, які здарыўся з Якіем Скрыганом, гаворыць аб мажлівасьці няправільнага падыходу да кадраў пралетарскіх пісьменьнікаў, бюро філіі просіць аб усіх пытаньнях такога характару, якія будуць датычыць белаг'аўцаў - студэнтаў, зьвяртацца наперад з філіяй БелАПП'у».

Аб чым сьведчыць гэта, а надворнага боку як быццам зусім баскрыўдная, пастанова бюро Менскай філіі? Яна гаворыць аб тым, што бюро Менскай філіі фактычна замяшалася перад тварам адзначаных вышэй шкодных настроеў і замест барацьбы з імі аб'ектыўна скацілася на шлях абароны іх. Прыгледзімся да сутнасьці гэтае пастановы. Перш за ўсё паком, нібыта, ігнараваньня БелАПП. Ужо адно тое, што БелАПП быў паведамлены аб справе Скрыгана, дзякуючы чаму БелАПП'ам і быў вылучаны прадстаўнік для ўдзелу ў вырашэньні гэтага пытаньня, сьведчыць аб тым, што ніякага «ігнараваньня» ня было. Справа можа ісьці ў лепшым выпадку толькі аб тэхнічнай недарочнасьці з боку прафкому падфаку, што апошнім ня было своячасова паведамлена аб часе пасяджэньня (хаця фактычна і гэтага ня было!). Але ці дае гэта падставу для агульнага абвінавачаньня ўсіх грамадзкіх арганізацый БДУ ў сьвядомым ігнараваньні БелАПП'у? Такое агульнае абвінавачаньне нельга інакш расцэньваць, як паклёп на пралетарскае студэнцтва БДУ.

Такім-жа паклёпам на студэнцкія грамадзкія арганізацыі БДУ зьяўляецца і другі пункт пастановы бюро Менскай філіі, дзе выключэньне Скрыгана разглядаецца, як няправільны падыход да кадраў пралетарскіх пісьменьнікаў наогул. Зразумела рэч, што было-б буйнейшай памылкай, калі-б мы сьцьвярджалі, што ў сьценах БДУ няма элемэнтаў варожых палітыцы нашай партыі наогул і, у прыватнасьці, беларускай пралетарскай літаратуры. Разам з актывізацыяй клясавага ворага на ўсіх вучастках нашага будаўніцтва наглядаецца актывізацыя кулацка - нэпманскіх нашыянал - дэмакратычных, вялікадзяржаўна - шавіністычных і іншых варожых элемэнтаў, так ці інакш прасякнуўшых у рады студэнцтва. Але з усімі гэтымі варожымі элемэнтамі пралетарскае студэнцтва БДУ, пад кіраўніцтвам партыйнай арганізацыі, увесь час вяло і вядзе самую рашучую, самую бязьлітасную барацьбу, выкідваючы гэтыя варожыя элемэнты са сваіх радоў па меры іх выкрыцьця. І было-б, зразумелая рэч, зусім не па-бальшавіцку альмаўляць таго, што ў гэтай жорсткай барацьбе бязумоўна могуць мець месца паасобныя памылкі ў падыходзе да паасобных студэнтаў (у тым ліку і пісьменьнікаў) з боку паасобных студэнцкіх арганізацый. Але такія паасобныя памылкі ні ў якім разе не даюць ніякіх падстаў для агульнага абвінавачаньня грамадзкіх арганізацый БДУ у няправільным падыходзе да кадраў пралетарскіх пісьменьнікаў. Такое агульнае абвінавачаньне можа толькі граць на руку тым варожым элемэнтам, якія ў свайм імкненьні сарваць вялізарную напружаную работу па выхаваньні новых пралетарскіх кадраў (у тым ліку і літаратурных пралетарскіх кадраў), якая праводзіцца нашай партыяй і, у прыватнасьці, партыйнай арганізацыяй БДУ, — распаўсюджваюць хлусьню аб тым, што ў БДУ няма, нібыта, «адпаведных умоў» для вучобы пралетарскіх пісьменьнікаў.

Стаўшы на шлях агульнага абвінавачаньня грамадзкіх студэнцкіх арганізацый у «ігнараваньні» БелАПП'у, у няправільным падыходзе да кадраў пралетарскіх пісьменьнікаў і г. д. — бюро Менскай філіі па сутнасьці выявіла незадаровыя настроі найменш устойлівай часткі сваіх членаў, настроі — клясавай істотай і карыснымі якіх (як мы ўжо высьветлілі) зьяўляецца кулацкі ўплыў на паасобныя зьвены БелАПП'у.

Мы не сумняваемся ў тым, што гэтыя настроі маюць месца сярод зусім незначнай часткі членаў БелАПП'у. Мы лічым, што бюро Менскай філіі па сутнасьці робіць паклёп на Менскую філію, калі прыпісвае гэтыя настроі большасьці членаў філіі. І тое, што бюро Менскай філіі ў сваёй пастанове якраз і выходзіць з гэтых настроеў, не дае ім ніякай палітычнай ацэнкі, — сьведчыць толькі аб палітычнай і клясавай нячулясьці кіраўнікоў філіі.

У сьвятле ўсяго вышэйадзначанага набывае асаблівы сэнс патрабаваньне бюро Менскай філіі да грамадзкіх арганізацый БДУ аб папраўдзе ўзгадненні з ім усіх пытаньняў, якія будуць датычыць студэнтаў - белаг'аўцаў. Гэтае патрабаваньне, якое грунтуецца на агульным абвінавачаньні грамадзкіх арганізацый БДУ ў ігнараваньні БелАПП'у, у няправільным падыходзе да кадраў пралетарскіх пісьменьнікаў, нельга па сутнасьці інакш кваліфікаваць, як адрыжку традыцый каставасьці, як спробу супроцьстаўленьня сябе партыйным і грамадзкім арганізацыям у якасьці нібыта манапольнага прадстаўніка пралетарскіх пісьменьнікаў.

Уся шкоднасьць і палітычная памылковасьць пазыцыі кіраўнікоў Менскай філіі яшчэ больш наглядна выступіць, калі мы прымем пад увагу, што ўвесь сьр-бор загарэўся ў сувязі з выключэньнем з БДУ Скрыгана.

Хто-ж такі Янка Скрыган? Паходзіць ён з буйной кулацкай гаспадаркі, якая ў 1924-25 годзе налічвала 35 дзесяцін зямлі, 14 кароў, 3 коняй і г. д., у 1929 годзе была абрэзана; у 1928-29 г. была абкладзена ў індывідуальным паралку (75 проц. падбаўкі) у разьмеры 300 руб.; гаспадарка ўвесь час карысталася пастаяннай і сэзоннай наёмнай працай. Зараз, у сувязі з суцэльнай калектывізацыяй у Слуцкім раёне гаспадарка Скрыгана раскулачана. Бацька Скрыгана на працягу 19 год быў царкоўным старастай. Янка Скрыган да апошняга часу не парываў сувязі з гаспадаркай і, як член гаспадаркі, разам з усімі іншымі членамі сям'і пазбаўлен права голасу. Пры паступленьні ў БДУ Янка Скрыган захаваў сваё сацыяльнае нахаджэньне і маемаснае становішча сваёй гаспадаркі.

І вось, выключэньне гэтага кулака з БДУ якраз і паслужыла поводам для папічных настроеў некаторых адзінак членаў БелАПП, для лямантаў аб няправільным падыходзе да кадраў пралетарскіх пісьменьнікаў і г. д.!

Палітычная блізарукасьць, якая праяўлена бюро Менскай філіі ў справе Скрыгана, узьнімае яшчэ раз на ўвесь рост пытаньне аб самакрытычным у літаратурным асяродзішчы. «Справа Скрыгана» яўна сыгналізуе, што ў справе разгортваньня самакрытыкі ў Менскай філіі ня ўсё добра. Досыць паказаць на тое, што пытаньне аб Скрыгану, аб тых настроях, якія вакол яго выключэньня з БДУ вынікі, дагэтуль ня вынесена на шырокае абгаварэньне членаў філіі, ня гледзячы на тое, што далёка ня ўсе члены філіі адмоўкава расцэньваюць як самое выключэньне Скрыгана з БДУ, так і паводзіны бюро філіі ў гэтай справе.

Прарыў у кіраўніцтве Менскай філіі БелАПП зноў напамінае наколькі актуальным зьяўляецца паказаньне тав. Сталіна, зробленае ім на красавіцкім пленуме: «Каб адбіць супраціўленьне клясавых ворагаў і ачысьціць шлях для руху сацыялізму, патрэбна, апрача ўсяго іншага, адтачыць усе нашы арганізацыі, ачысьціць іх ад бюракратызму, палепшыць іх кадры»... А галоўнай умовай пасьпяховага вырашэньня гэтай задачы зьяўляецца безагаворачнае разгортваньне бальшавіцкай самакрытыкі.

Мы цалкам упэўнены ў тым, што пад непасрэдным кіраўніцтвам партыі БелАПП злолее, на падставе разгорнутай самакрытыкі, хутка ліквідаваць прарыў у кіраўніцтве Менскай філіі і выйдзе з гэтага тупіку яшчэ больш моцнай, больш баяздольнай. Манэўры клясавага ворага, пад якой-бы маскай ён не выступаў былі і будуць бязьлітасна біты.

Студэнты БДУ — ЧАРНУШЭВІЧ, А. ЛЕВІН, Ш. ГОДАНД.

Аб разгортваньні палітасьветнай работы з прынятымі кандыдацкімі масамі

Пастанова ЦК УсеКП(б)

Імкненьне найшырэйшых мас рабочых уступіць у партыю і паставленая апошнім пастановамі ЦК задача дваццацігадзьдзя з XVI зьезду партыі ліку рабочых ад варштату ў складзе дваццаці да 50 проц. патрабуюць пашырэньня існуючай нізавой сеткі партыйнае асьветы (партыйныя школы, палітгурткі) і дадатковага прыцягненьня прапагандысцкіх кадраў для партыйна-асьветнай работы з новымі прынятымі кандыдацкімі масамі.

Разам з тым пашырэньне існуючай сеткі партыйнае асьветы павінна быць разьлічана таксама і на ахват беспартыйнага рабочага актыву, асабліва актыву брыгадніку, у мэтах павышэньня палітычнага ўзроўню, клясавай сьвядомасьці і прапаганды сярод беспартыйнага рабочага актыву бальшавіцкай партыйнасьці.

ЦК лічыць неабходным:

а) Абавязаць крайкомы, абкомы і ЦК нацкампартый арганізавацъ на прадпрыемствах для ўступіўшых у партыю кандыдацкіх мас адкрытыя гутаркі кіраўнічых работнікаў партыйных камітэтаў і кіраўнікоў гаспадарчых, савецкіх, кооперацыйных і прафсаюзных арганізацый па найбольш актуальных пытаньнях сацыялістычнага будаўніцтва. Гутаркі праводзіць з прыцягненьнем да актыўнага ўдзелу ў іх кандыдацкіх мас.

б) Для ўсваеньня агульных асноў праграмы і статуту партыі ў цясьнейшай сувязі з бягучай палітыкай партыі арганізаваць для нанава ўступіўшых у партыю кандыдацкіх мас, не ахваченых існуючай сеткай партыйнае асьветы, дадатковую сетку паротнатэрміновых палітгурткоў і партшкол.

Культаддзелу ЦК УсеКП(б) у 10-цідзённы тэрмін выдаць праграмы партыйна-асьветнай работы з новымі кандыдацкімі масамі.

в) Палітыка-асьветная работа з кандыдатамі павінна быць арганізавана з разьлікам на 2-3 месяцы пры 2 заняткох у дакаду. Пры гэтым, зьвязваючы партыйную вучобу з задачамі падрыхтоўкі і ўцягненьня новых уступіўшых у партыю кандыдатаў у практычную партыйна-грамадзкую работу на вытворчасьці і ў пралетарскіх арганізацыях, трэба недапускаць лішняй перагрузкі і адрыву іх ад партыйнай вучобы.

г) Забесьпячэньне вучобы кандыдацкіх мас прапагандысцкімі кадрамі патрабуе шырокага прыцягненьня для гэтай работы рабочых-прапагандыстых, пераважна з ліку таварышоў, якія атрымалі палітычную падрыхтоўку ў марксыцка-ленінскіх гуртках, саўпартшколах і г. д., з таксама са складу найбольш палітычна падрыхтаваных работнікаў мясцовых партыйных арганізацый.

Патрэбна таксама максымальнае прыцягненьне для работы з новымі ўступіўшымі ў партыю кандыдацкімі масамі палітычна падрыхтаваных членаў партыі са складу работнікаў савецкіх устаноў, разглядаючы для іх гэту работу, як асноўную партыйную нагрузку.

У вясковых арганізацыях да прапагандысцкай работы з прынятымі ў партыю батранамі, калгаснікамі павінны быць прыцягнуты студэнты камвузаў, сельска-гаспадарчх ВНУ і саўпартшкол, якія камандыруюцца для работы на вёску.

д) Для падрыхтоўкі новых кадраў рабочых-прапагандыстых арганізаваць у буйных прамысловых раёнах сотку курсаў тэрмінам ад 2 тыдняў да аднаго месяца з вызваленьнем на гэты тэрмін прыцягнутых на курсы ад работы на вытворчасьці. Выдаткі па правядзеньні гэтых курсаў адносіць за кошт партбюджэту, з утрыманьнем курсантаў (аплата фактычнага іх заработку на вытворчасьці)—за кошт гаспадарчых органаў.

Курсы для падрыхтоўкі новых кадраў рабочых-прапагандыстых арганізуюцца толькі там, дзе ўжо скарыстаны поўнасьцю наяўныя прапагандысцкія сілы, якія прайшлі адпаведную падрыхтоўку. Арганізацыя гэтых курсаў зацьвярджаецца краявым камітэтам партыі. Забесьпечыць замацаваньне падрыхтаваных кадраў рабочых-прапагандыстых за прадпрыемствамі, якія паслалі іх на курсы, на ўвесь пэрыяд ленінскай вучобы кандыдатэў.

е) У мэтах павышэньня падрыхтоўкі рабочых-прапагандыстых прызнаць мэтазгодным рэгулярнае скліканьне прапакалектываў непасрэдна пры фабрычна-заводзкіх партыйных арганізацыях. У цэнтры ўвагі прапакалектываў паставіць выбучэньне пытаньняў праграмы заняткаў з кандыдацкімі масамі ў цеснай увязцы з пытаньнямі данзе вытворчасьці, прамфінпляну, сацыялістычнага спаборніцтва і г. д.

ж) Усклясьці на орг. і прапгрупы ЦК абавязак актыўнага ўдзелу ў арганізацыі партыйна-асьветнай работы з новымі прынятымі кандыдацкімі масамі, у падборы і падрыхтоўцы рабочых-прапагандыстых і ў арганізацыі і кіраўніцтве работай прапакалектываў на прадпрыемствах.

Увага партыі і грамадзкасьці—перавыбарам сельсаветаў

НОВЫЯ СЫГНАЛЫ

На працягу ходу кампаніі перавыбараў сельсаветаў «Зьвязда» ня раз зварачала увагу партыйных арганізацый і савецкай грамадзкасьці на ненармальнасьці, якія выявіліся ў працэсе гэтай работы.

Асобныя мясцовыя арганізацыі ня ўлічылі ўсёй палітычнай важнасьці перавыбараў гэтага году, не зразумелі задач перабудовы Саветаў пад пэўнгам тварам да калгасу.

Арганізацыя батрацка-бядняцкіх мас, узмацненьне бядняцка - серадняцкага блёку, зусім выбылі з-пад увагі некаторых мясцовых арганізацый.

Атрыманыя весткі з месц гавораць аб тым, што сыгналы «Зьвязды» ня ўсюды былі пачуты, яны (весткі) стракаціць радам фактаў агідных адносін мясцовых арганізацый да гэтай выключна важнай палітычнай кампаніі.

Як можна назваць такія факты, калі члены саўету пад носам парт'ячэйкі займаюцца арганізацыяй кулацкіх сходаў, а калі сход назначаецца рабочай брыгадай, дык на ім няма ні аднаго партыйца, камсамольца — члена савету? Або калі назначаецца перавыбарчы сход і не зьяўляецца ні адзін член выбарчай камісіі? (Грэскі раён, Менішчына).

Або калі з прычыны адсутнасьці работы сярод жанчын гэтай работай займаецца кулацтва, у выніку чаго ў некаторых вёсках жанчыны правальваюць кандыдатуры ячэек і бедноты (БЫХАЎСКІ, ЧАЎСКІ і КАСЬЦЮКОВІЦКІ раёны, Магілеўскае округі).

Адзначаны факт, калі прадстаўнік парт'ячэйкі са сходу беднаты праганяе СЕРАДНЯКОЎ, баючыся, «што сход стушуецца» (АСЬВЕЙСКІ раён, ПОЛАЧЧЫНА).

Усё гэта, бязумоўна гаворыць аб злачынна - нядбайных адносінах да важнейшай палітычнай кампаніі, аб змазваньні яе — такая «работа» толькі на руку нашаму клясаваму ворагу.

Асабліва зварачае на сябе увагу ход кампаніі ў МАГІЛЕЎСКАЙ акрузе. Як відаць, паасобныя арганізацыі ў Магілёўшчыне зусім ня цікавяцца ходам перавыбараў па акрузе, напляваецельскі адносяцца да дырэктыў партыі, зусім ня ўлічваюць вялікія прарывы, якія меліся ў акрузе.

Сёньня карэспандэнцыі з Магілева паведамляюць, што процант выбраных камуністых і камсамольцаў у новыя сельсаветы панізіўся.

Пара ўжо цьвёрда ведаць, што ўсякае паслабленьне партыйнага кіраўніцтва перавыбарамі ёсьць нішто іншае, як выразна выяўлены правы апартунізм.

Пара зразумець, што бяз моцнага клясавага савету, без партыйнага кіраўніцтва ў новых саветах, нельга арганізаваць беднату, нельга ўзмацніць бядняцка - серадняцкі блёк, нельга ліквідаваць кулака, нельга правесьці суцэльнай калектывізацыі і нельга будаваць сацыялістычную вёску.

Партыя дала выразную ўстаноўку па пытаньні аб узмацненьні сельсаветаў, аб абарачэньні іх у арганізатараў і кіраўнікоў сацыялістычнай перабудовы вёскі. Без партыйнага штодзённага ўплыву і кіраўніцтва гэта задача ня будзе выканана.

Мы зварачаем увагу на ход перавыбарчай кампаніі ўсіх арганізацый КП(б)Б.

Адпаведна задачам перавыбарчае кампаніі, партарганізацыі, а ў першую чаргу, Магілеўская, павінны ўзмацніць сваё кіраўніцтва перавыбарамі.

Час не чакае. Тэрмін кампаніі канчаецца, а таму трэба безадкладна мабілізаваць усе сілы і ўсю ўвагу на справу ўзмацненьня нізавых органаў пралетарскай дыктатуры, якім павінен зьявіцца перавыбраны сельсавет.

88,2 ПРОЦ. КАЛГАСЬНІКАЎ

(Ад нашага магілеўскага карэспандэнта)

На 5-га сакавіка па 5-ці раёнах акругі (няма вестак з Клімавіцкага) поўнасьцю праведзены перавыбары ў 65 сельскіх саветах, ці па 909 выбарчых вучастках.

У новы склад сельсаветаў выбрана 2.850 членаў, з якіх жанчын—24 проц., партыйцаў—8,8, камсамольцаў—6,2. Па сацыяльным складзе: рабочых, батракоў і сельска-гаспадарчых рабочых—6,2 проц., беднякоў—62 проц. і сераднякоў—37,7 проц. З агульнага ліку выбраных членаў сельсаветаў—88,2 проц. калгасьнікаў.

Такім чынам, на 5-га сакавіка па акрузе перавыбрана каля паловы сельсаветаў.

Без падрыхтоўкі

У некаторых раёнах Магілеўскае акругі партыйныя, савецкія і камсамольскія арганізацыі ня ўлічылі ўсёй палітычнай важнасьці кампаніі перавыбараў сельсаветаў, гэту работу зусім не арганізавалі. Ніякай падрыхтоўчай работы з батрацка-бядняцкімі масамі не праведзена, зусім адсутнічала работа сярод жанчын, ніякай растлумачальнай работы сярод бядняцка-серадняцкіх мас вёскі не праведзена. Вельмі слабы ўдзел пералічаных сельсаветаў у практычным правядзеньні гэтай работы.

У выніку процант выбраных у саветы камсамольцаў і партыйцаў па Магілеўскай акрузе панізіўся. Напрыклад, на 1 сакавіка выбраных камсамольцаў было 7 проц., а на 5-га сакавіка—ужо 6,2 проц.; партыйцаў на 25-га лютага было выбрана 14,7 проц., на 1-га сакавіка—11 проц. і на 5-га сакавіка—8,8 проц.

Гэтыя моманты паказваюць, што асобныя мясцовыя арганізацыі да перавыбарчай кампаніі адносяцца са злачыннай нядбайнасьцю, кіраўніцтве іх гэтай работай а кожным днём паспляпяецца.

Ал. СЯНКЕВІЧ.

АБ СКАЖЭНЬКІ ЛІНІІ ПАРТЫІ Ў ПРАВЯДЗЕНЬНІ СПРАВАЗДАЧНА-ПЕРАВЫБАРЧАЙ КАМПАНІІ ПАРТОРГАНАЎ КАСТРЫЧНІЦКАЙ ПАРТАРГАНІЗАЦЫІ

Пастанова бюро Менскага АК КП(б)Б

1. Бюро АК КП(б)Б канстатуе, што Кастрычніцкі РК КП(б)Б, у прыватнасьці сакратар РК тав. Дзічкоўскі, у падрыхтоўчай рабоце і ў правядзеньні самой справаздачна - перавыбарчай кампаніі бюро ячэек дапусьціў грубыя палітычныя памылкі ў тым, што:

а) у партыйнай арганізацыі ня быў належным чынам прапрацаваны дырэктыўны ліст ЦК КП(б)Б аб перавыбарах парторганаў, а таксама раённым камітэтам ня былі даны вычарпальныя паказаньні ячэйкам аб справаздачна-перавыбарчай кампаніі, у выніку чаго ячэйка КП(б)Б лямпавай фабрыкі наперакор дырэктывам ЦК і Менскага АК КП(б)Б аб тым, што «справаздачна-перавыбарчыя сходы, як у гарадзкіх ячэйках, так і вясковых праводзіць адкрытыя, а шырокім прыцягненьнем рабочай масы...», правяла закрытыя справаздачна-перавыбарчы сход;

б) сакратаром РК КП(б)Б т. Дзічкоўскім, ня гледзячы на дырэктывы ЦК і АК КП(б)Б аб тым, што «перавыбары трэба праводзіць пры самым строгім захаваньні унутрыпартыйнай дэмакратыі, пры самым шырокім абгаварэньні асобных кандыдатур з забесьпячэньнем пэрсанальнага (а не па сьпісах) галасаваньня...» дапусчана грубейшае парушэньне ўнутрыпартыйнай дэмакратыі ў тым, што замест разгортваньня шырокай работы сярод усяе ячэйкі па падборы лепшых найбольш працаздольных кандыдатур у склад бюро, т. Дзічкоўскі склікаў групу партыйцаў, у якую ўвайшлі былыя члены распушчанага бюро і вызначыў сьпіс кандыдатур у склад бюро ячэйкі.

2. Усё гэта з відавочнай выразнасьцю сьведчыць аб тым, што РК партыі ў практычнай рабоце не забясьпечыў правільнага бальшавіцкага кіраўніцтва ў справаздачна - перавыбарчай кампаніі парторганаў, а яго асобныя прадстаўнікі не ўявілі сутнасьці пастановы ЦК і АК аб неабходнасьці прыцягненьня шырокіх пластоў рабочых мас на справаздачна-перавыбарчыя сходы і аб удзеле ўсёй партарганізацыі ў падборы кандыдатур у кіраўнічыя органы, а наадварот, скліканьнем груп, для абгаварэньня кандыдатур у склад бюро ў яч. вагонных майстэрань, куды (у групу) ўваходзілі і члены распушчанага бюро, а таксама ігнараваньнем рабочай масы на лямпавай фабрыцы (правядзеньне закрытага партсходу), не дапамагалі разгортваньню сапраўднай самакрытыкі і ўнутрыпартыйнай дэмакратыі зводзячы гэтым самым значэньне справаздачна-перавыбарчае кампаніі і ўдзел рабочых мас у сацыялістычным будаўніцтве.

Разам з тым, бюро АК з усёй рашучасьцю надкрэсьлівае, што з боку бюро райкому, замест мабілізацыі ўсяе энэргіі на сапраўднае бальшавіцкае абгаварэньне сваіх памылак на падставе самакрытыкі і прыняцьця тэрміновых мерапрыемстваў да безадкладнага іх выпраўленьня апошнім (бюро райкому), выразілася пытаньне ў палавінчатай форме, без выстарчальнай палітычнай ацэнкі, рэагаваньня і завастрэньня ўвагі ўсіх партарганізацый на дапушчаныя памылкі і іх зьяўленьне.

3. За скрыўленьне лініі партыі ў практычным правядзеньні справаздачна-перавыбарчае кампаніі парторганаў і несвячасовае рэагаваньне на меўшыя месца парушэньні ўнутрыпартыйнай дэмакратыі, у ячэйцы вагонных майстэрань, ігнараваньне рабочае масы ў ячэйцы лямпавай фабрыкі, абвясьціць бюро Кастрычніцкага РК вымову.

4. Бюро АК катэгарычна прапануе РК КП(б)В з усёй рашучасьцю, на падставе самакрытыкі, безадкладна абгаварыць і арганізацыі дапушчаныя памылкі і прыняць рашучыя мерапрыемствы да іх выпраўленьня.

5. Адмяніць перавыбарчы сход бюро ячэйкі на лямпавай фабрыцы.

6. Ануляваць сьпіс кандыдатур, намечаных у склад бюро ячэйкі вагонных майстэрань.

7. Даручыць арганізацыйна-інструктарскаму аддзелу АК разам з Кастрычніцкім РК тэрмінова вызначыць рад канкрэтных мерапрыемстваў, якія-б забясьпечылі належнае правядзеньне справаздачна-перавыбарчае кампаніі парторганаў у Кастрычніцкай партарганізацыі і ліквідавалі-б дапушчаны прарыў.

8. Пастанову надрукаваць у газэтах.

Пленум ЦКК КП(б)Б

Пленум скончыў абмеркаваньне дакладу т. т. Калініна і Эгле. У спрэчках выступілі т. т. Мундау, Пасюкевіч, Клуйша, Яфімаў, Матус, Ляўкаў і Зелянкоўскі. Таварышы спыніліся на асноўных пытаньнях работы Полацкай АКК-РСІ і падкрэсьлілі памылкі і хібы, дапушчаныя АКК. Т. т. падкрэсьлілі што Полацкая АКК невыстарчальна змагалася за разгортваньне самакрытыкі, што абумовіла рад сур'ёзных прарываў на іншых вучастках работы.

Потым пленум заслухаў даклад тав. Лазоўскага аб масавай рабоце КК-РСІ.

Тав. Лазоўскі ў сваім дакладзе адзначыў, што масавая работа на даным этапе набывае вялізарнае палітычнае значэньне. Дакладчык дэтальна спыніўся на пытаньнях масавай работы КК-РСІ, падкрэсьліўшы ўсю актуальнасьць і важнасьць гэтага пытаньня.

РОЛЯ ІНЖЫНЭРНА-ТЭХНІЧНЫХ І НАВУКОВЫХ ПРАЦАЎНІКОЎ У САЦЫЯЛІСТЫЧНЫМ БУДАЎНІЦТВЕ

ШКОДНІЦТВА Ў ВЫДАВЕЦКАЙ СПРАВЕ

Я езджу нядаўна на калгасах і вёсках, наведаў некалькі школ і натрапіў на адзін падручнік. Я надгад разгарнуў старонку, і вы думаеце, што мне кінулася ў вочы ў гэтым падручніку?—У ім праводзіцца, прыкладна, такая думка: «Ня гледзячы на тое, што эканоміка і нэпры ў нас у Саюзе ССР багатыя, а жыцьцё чамусьці занадта беднае» (гэта значыць, што Савецкая ўлада ня можа гаспадарыць). Як павашаму што азначае такая думка. Гэта значыць у завуаляваным парадку гаворыцца: «краіна наша вялікая і багат, але парадку ў ёй няма, прыдзеце і кіруйце»... Як вы гэта назавяце інакш, як ня шкодніцтвам на культурна-ідэалёгічным фронце. А ці толькі гэта ёсьць. Не, ёсьць яшчэ многа такіх пэрлаў што ад іх так і пахне яўнай непрыхаванасьцю да пралетарскай дыктатуры.

На вялікі жаль, пашы мэтадкомы сядзяць і вушамі хлопаюць, а там, на месцах, у школах, сотні тысяч дзяцей гадамі выхоўваюцца на гэтай, з дазволу сказаць, ідэалёгічнай прадукцыі, якая ўбіваецца клінам у іх галовы. Мы тут гаворым «прыемныя» рэчы, абменьваемся прывітаньнямі, выносім сотні пышных дэкларацый і пастаноў, а там сыстэматычна, кожны дзень, кожны тыдзень, кожны год фармуюцца кадры сотні тысяч новых будаўнікоў з дзяцей і з моладзі на прадукцыі яўна шкоднай. Якая-ж цана нашым прыгожым прамовам і дэкларацыям, калі там у масах выхоўваецца ідэалёгія соцень тысяч людзей на гэтых глупствах. Учарайшні вучань першаначатковай школы, якога мы дзесятак гадоў вучылі—сёньня ўжо ўдзельнік сацыялістычнага будаўніцтва, сёньня ён ужо актыўны працаўнік, і выяўляецца, што мы дзесяткі год вучылі яго на гэтых падручніках. Выходзіць, што ўчарайшні вучань, а сёньня той чалавек, які прымае ўдзел у палітыцы, ён выхоўваўся часамі і ня так, як нам трэба. Вы ніколі мяне не пераканаеце, што гэта «толькі памылка». Я лічу, што гэта значна больш чым памылка, што ў справах культурных іменна такім чынам праводзіцца неўпае шкодніцтва, завуаляванае часта або ў нацыянальным фарбы, або яшчэ дрэнным воданьнем марксыцкіх мэтадаў сацыяхаваньня, або яшчэ чым-небудзь іншым. На справе-ж усё гэта мае на мэце падрыў дыктатуры пралетарыяту, на справе аб'ектыўна гэта прыводзіць да таго, што ў нашых школах рыхтуюць, выхоўваюць за нашы грошы часамі і ня нашы кадры, кадры, якія не заўсёды здольны потым весьці барацьбу за савецкую ўладу, за дыктатуру пралетарыяту.

Абавязак у першую чаргу нашых савецкіх і партыйных арганізацый, асабліва мэтадкому, зараз-жа за гэтым пільна сачыць.

А што-ж, таварышы, усе інжынэрныя, культурныя і навуковыя працаўнікі, хіба вы не несяце за гэта адказнасьці? Вы-ж павінны давацъ нашым школам, ВНУ добрыя падручнікі, добрую прадукцыю, на якой павінны выхоўвацца сотні тысяч моладзі, як новыя працаўнікі на сацыялістычным фронце. А якжа гэта вы можаце рабіць, калі вы ня будзеце ўважліва сачыць за добраякасьнасьцю ідэалёгічнай прадукцыі і за добрасумленнасьцю сваіх таварышоў па прафесіі.

Я вам больш гаварыў пра будаёныя і часамі сумныя справы, але я думаю, што раз мой даклад называўся «задачы спэцыялістых у справе сацыялістычнага будаўніцтва», то для таго, каб правільна рашыць гэтыя задачы і правільна вызначыць шлях удзелу ў сацыялістычным будаўніцтве шырокіх колаў спэцыялістых, трэба паглядзець і на сапраўдную рэчаіснасьць, што ў нас робіцца ў жыцьці, і шляхам сур'ёзнай праверкі фактаў з жыцьця, шляхам праверкі сваіх радоў і на падставе ачысткі гэтых радоў праз выключэньне шкодніцкіх элемэнтаў са сваіх арганізацый, можна і трэба вызначыць плян сапраўднага ўдзелу ў сацыялістычным будаўніцтве ўсіх інжынэраў, тэхнікаў і навуковых працаўнікоў.

У КЛЯСАВАЙ БАРАЦЬБЕ НЯМА «ДЕЯЛЬНАСЬЦІ» І «НЭЙТРАЛЬНАСЬЦІ»

Мне хацелася-б яшчэ сказаць тое, аб чым таварышы тут гаварылі ў сваіх зарытальных—гэта аб так званай «дэяльнасьці», «нэйтральнасьці» і так званай «бесспартыйнасьці». Вось, таварышы, у чым справа. Кам

РАШУЧА СПЫНІЦЬ СКРЫУЛЕНЬНІ

ЗАМАЦАВАЦЬ ПРОЙДЗЕНЫ ЭТАП КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ

Адміністраваньне, чыноўніцкае дэкрэтаваньне—дыскрэдытуе калгасны рух, льле ваду на млын правага ўхілу

Перавесьці калгасы на новы статут. Пераключыць усю энэргію на падрыхтоўку да палявых работ

ДА АГЛЯДУ МІЖЗБОРАВАЙ РАБОТЫ

Пераменны склад—на выкананьне задач, пастаўленых партыяй

(З пастановы Сакратарыяту ЦК КП(б)Б)

Агляд міжзборавай работы павінен зрабіць моцны зрух у справе прыцягненьня ўвагі пралетарскае грамадзкасьці да пытаньняў ваеннай небясьпекі, умацненьня абароназдольнасьці СССР, далейшага прыцягненьня пераменьнікаў, па-завайскавікоў і дапрызыўнікаў на выкананьне задач, пастаўленых камуністычнай партыяй па калектывізацыі вёскі, ліквідацыі кулацтва, як клясы, на грунце масавай калектывізацыі і гэтым самым паскарэньня сацыялістычнай перабудовы вёскі.

Задачамі агляду зьяўляюцца: шырокая масавая самаправерка стану ваеннай і ваенна-палітычнай вучобы ў міжзборавы перыяд, у першую чаргу самаправерка якасьці праводзеньня кароткатэрміновых зборaў, выкананьня індывідуальных заданьняў, работы гурткоў ваенных ведаў, вайсковых куткоў і цыраў.

Масавай самаправеркай выявіць, наколькі ўдаецца пераменьнікі, па-завайскавікі і дапрызыўнікі ў практычную работу па ажыцьцяўленьні генэральнай лініі камуністычнай партыі ў горадзе і на вёсцы.

Самаправерка павінна галоўны націск зрабіць на наступным: наколькі пераменны склад, па-завайскавікі і дапрызыўнікі зьяўляюцца клясава-сьвядомымі і актыўнымі памочнікамі партыі і саветкае ўлады, начальнікамі і перадавікамі у калектывізацыі сваіх гаспадарак, у абагуленьні сродкаў вытворчасьці калгасаў, у ліквідацыі кулацтва як клясы, на базе суцэльнай калектывізацыі, правядзеньні веснавой пасеўнай кампаніі, зборы сродкаў на папярэднія заказы на трактарныя калёны, выкананьні дагавораў па сацпаборніцтве на прадпрыемствах і ў калгасах.

Трэба праверыць удзел пераменьнікаў, дапрызыўнікаў і па-завайскавікоў у рабоце добраахвотных таварыстваў (асабліва Асоавіяхіму і Чырвонага Крыжу), дапамогу і ўдзел грамадзкіх арганізацый у найбольшай пасьпяховасьці міжзборавай работы.

Гэта пастанова Сакратарыяту ЦК КП(б)Б ускладае паўную задачы на рад арганізацый э тым, каб узарушыць пралетарскую грамадзкасьць, арганізаваць масавую самаправерку стану міжзборавай работы так, каб крытыкай і самакрытыкай былі выяўлены слабыя месцы міжзборавай работы і былі прыняты меры да іх зьнішчэньня і значнага паляпшэньня ўсёй сыстэмы міжзборавай работы.

Рыхтуемся да трохдзённых зборaў

Палітаддзелам №-скай дывізіі былі даны ўказаньні вайсковым часьцям аб правядзеньні агляду міжзборавай работы, як шырокай кампаніі.

Былі даны дырэктывы аб цеснай сувязі з мясцовымі арганізацыямі і пераменьнікамі.

Усе часьці паладзілі выезд начальніцкага складу на месцы для работы з пераменьнікамі і для правядзеньня гутарак аб значэньні трохдзённых зборaў, якія павінны адбыцца. Індывідуальныя заданьні, якія даюцца пераменьнікам, часта не даволі прапрацоўваюцца, а прычыны адсутнасьці патрэбных прылад, якімі пераменьнік мог-бы карыстацца. Слабе пастаўлена самадзейная работа пераменьнікаў і іх удзел у ваенных гурткох.

Ячэйкі Асоавіяхіму ня здолелі яшчэ да гэтага часу так паставіць сваю работу, каб зацікавіць пераменьніка, каб ён хацеў займацца ў гэтых гурткох.

У часе агляду вывучаецца пытаньне як можна і патрэбна паставіць работу з пераменьнікамі ў сувязі з калектывізацыяй. Намячаецца арганізацыя спэцыяльнага інстытуту ўпоўнаважаных тэрытарыяльных часьцей з пераменьнікаў у калгасах для сувязі пераменьнікаў з тарчасьцямі. У кожным калгасе намячаецца арганізацыя ваенных гурткоў і правядзеньне сходаў пераменьнікаў на калгасах.

Пераменьнікі ў цэлым бяруць актыўны ўдзел у сацыялістычнай перабудове вёскі, зьяўляюцца ініцыятарамі і арганізатарамі калгасаў на вёсцы. Але ёсьць раёны, дзе работа пераменьнікаў у гэтым напрамку адстае. Асабліва гэта назіраецца ў Бярэзінскім раёне, дзе ў той час, як раён быў калектывізаваны на 40 проц., пераменьнікі былі калектывізаваны ўсяго на 21 проц. Зусім іншыя лічбы даюць пераменьнікі Барысаўскага раёну, дзе яны калектывізаваны на 80 проц., а раён—на 50 проц.

Асноўная задача трохдзённых зборaў—правесьці некалькі заняткаў у маштабе буйных аб'яднаньняў. Акрамя гэтага будзе звернута ўвага пераменьнікаў на ўдзел у сацыялістычным будаўніцтве на міжзборавай рабоце, якую пераменьнік павінен праводзіць.

Трэба адзначыць, што ўдзел мясцовых арганізацый у міжзборавай рабоце вельмі слабы. Асабліва адстаюць у гэтай справе прафсаюзы і ўстановы, якія зусім ня ведаюць аб патрэбнасьці правядзеньня міжзборавай работы. Зусім слаба праводзіцца работа па ліквідацыі ня пісьменнасьці сярод пераменьнікаў.

Зараз у сувязі з аглядам ужо ёсьць нейкі пералом, які яшчэ, зразумела зьяўляецца невыстарчальным для ўзьняцьця на належную вышыню міжзборавай работы.

А.

Пухавіцкі райком стаіць у баку

№ стр. полк праволіў аднадзенны збор чырвонаармейцаў-пераменьнікаў. Мясцовыя партыйныя і камсамольскія ячэйкі, сельсаветы зусім на ведалі аб зборы.

Для іх прыезд камскладу на раён быў, што сьнег на галаву. Прадстаўнікоў Пухавіцкага РВК і райкому партыі ні на адным з трох вучасткаў ня было.

З прычыны таго, што ніхто на месцы гэтым зборам ня цікавіўся, то і яўка пераменьнікаў ня была арганізавана і сваячасова.

Заняткі былі арганізаваны добра. Кожная рота ў асноўным была падзелена на тры групы, з якіх адна страляла, другая—была на тактычна-страявых заняткох, а ў трэцяй—праводзілі індывідуальныя заданьні.

На месцах нічога ня робіцца, каб уцягнуць пераменьнікаў у ячэйкі Асоавіяхіму і на пікуўкты. Чакаюць толькі выезду камскладу і лічаць, што работа з пераменьнікам гэта толькі работа кадру палка. Мясцовыя органы ў баку ад гэтае справы. За час гэтых зборaў былі праведзены сходы пераменьнікаў з дакладамі аб міжнародным становішчы і аб калектывізацыі сельскае гаспадаркі. Тут-жа праводзіўся запіс у калгасы, у першай роце запісалася 25 чалавек у калгас, у 3-й роце—41 чал.

Схол пераменьнікаў вітаў выпуск першай палыкі пяцігодкі і правёў папярэднюю падпіску, якая дала 200 руб.

Характэрна тое, што тыя пераменьнікі, якія ўвосень выяўлены, як кулакі, і індывідуальна абкладзены с.-г. падаткам, зьявіліся на збор сваячасова, але іх зараз-жа адпранілі са збору і выключылі са сьпісаў палка.

СКУРАТ.

Не назад, а ўперад

Веснавая пасеўная кампанія ўступае ў рашаючы этап. Мы перад самым пачаткам палявых работ. Уся энэргія, усе сілы нашых партыйных і савецкіх арганізацый, усёй калгаснай сыстэмы павінны быць неадкладна пераключаны на непасрэдную падрыхтоўку да выхаду ў поле.

Арганізацыйнае ўмацаваньне калгасаў, замацаваньне дасягнутых посьпехаў на фронце калектывізацыі—вось наша чарговая задача задач, без вырашэньня якой мы ня здолеем правесьці з посьпехам сяўбу, ня здолеем пасунуцца наперад для заваяваньня новых пазыцый на шляху да сацыялістычнай перабудовы вёскі.

Мы павінны з усёй рашучасьцю адзначыць і падкрэсьліць, што на радзе важнейшых вучасткаў пасоўнага фронту, ад перамогі на якіх залежыць у значнай ступені посьпех пасеўнае кампаніі, мы маем надзвычай павольнае прасоўваньне наперад. Да такіх уязьвімых вучасткаў належыць у першую чаргу слабае, злачынна слабае, абагуленьне рабочай жывёлы. Да гэтага часу па БССР абагулена толькі 37 проц. патрэбнай колькасьці рабочае жывёлы. За апошнія дэкады тэмп абагуленьня моцна паслабеў. Ствараецца ўражаньне, што гэта адказьнейшая задача, як быццам выпала з-пад увагі нашых арганізацый і работнікаў.

Яшчэ горш, чым з рабочаю жывёлаю, стаіць справа з кормам. Зямельныя органы зусім забыліся аб кармавой праблеме. Значнаму разбазараньню корму, аб небясьпецы якога сыгналізавала наша газэта, ня быў напожаны канец. І ў выніку, многія калгасы ўжо б'юць трывогу аб адсутнасьці корму для абагуленай жывёлы, атакуюць акруговыя і нават цэнтральныя арганізацыі патрэбаваньнямі аб высылцы корму. Ствараецца сур'ёзнейшая пагроза, што з прычыны адсутнасьці корму рабочая жывёла ў некаторых мясцох ня зможа выйсьці ў поле.

Многія мясцовыя арганізацыі замест таго, каб зрабіць упор на самым галоўным і асноўным, замест таго, каб напрудзіць усе сілы на правядзеньне абагуленьня рабочае жывёлы, насеньня і корму, накіравалі сваю ўвагу ў іншы бок. Ня гледзячы на катэгарычныя паказаньні, даныя ў артыкуле тав. Сталіна аб новым палажэньні аб сельска-гаспадарчай арцелі, ка мясцох яшчэ працягваюцца спробы перашкочыць праз арцель да камуны, абагульваецца ўся жывёла, замест таго, каб абагульваць тое, што паказана ў статуце.

Наша газэта зазначала на неабходнасьць неадкладнага правядзеньня ў жыцьцё новага статуту. Новы статут ужо значна пашыраны спрос бядняцка-серадняцкіх мас. Ад ім ведае вёска. Ня гледзячы на гэта, паведамленьні з месц гавораць аб тым, што некаторыя работнікі значнага марудзяць з пераводам калгасаў на новы статут. Мы гаворым—ЗЛАЧЫННА. Асобныя работнікі дапускаўшыя пры калектывізацыі самыя грубыя скажэньні партыйнай лініі, падмяняўшыя сапраўдную работу па мабілізацыі мас на сацыялістычную перабудову вёскі голым адміністраваньнем, прымусам, загадам дапускаўшыя перагібы, якія закранулі серадняка і бедняка—усе гэтыя работнікі ў некаторых мясцох аказваюць супраціўленьне пераводу калгасаў на новы статут. І гэта зразумела. Яны прабуюць замазаць утаіць свае грубейшыя памылкі. Замест неадкладнага выпраўленьня дапушчаных перагібаў, замест бальшавіцкай барацьбы за ўмацаваньне калгасаў, за далейшы якасны і колькасны рост калектывізацыі яны зрываюць ажыцьцяўленьне важнейшых і адназьнейшых дырэктыў партыі, паказаных у апошнім артыкуле т. Сталіна. Спрова даходзіць да таго, што ў Крычаве былі выпадкі ўтойваньня ад сялян нумароў газэты з артыкулам тав. Сталіна.

«Зьвязда» ня раз падкрэсьлівала на сваіх старонках, што мясцовыя партыйныя арганізацыі павінны стаць на чале пераводу калгасаў на новы статут, узяць на сябе ініцыятыву і кіраўніцтва гэтай справай. Пайсьці ў масы, пайсьці ў калгасы, на батрацка-бядняцкія нарады, на агульныя сходы калгаснікаў тлумачыць, папупрызываць партыйныя дакуманты. Расказваць масам сутнасьць артыкулу тав. Сталіна і новага статуту калгасаў. Увесьці ў арганізаванае рэчышча перавод на новы статут. Не дапускаць стыхійнасьці. Давяць рашучы адпор кулацкім вылазкам.

На жаль, у некаторых мясцох гэтага ня робіць і тым самым дзейнічаюць на руку кулаком. Клясавы вораг разгортвае шалёную агітацыю, ён прабуе сарваць калектывізацыю, сарваць падрыхтоўку да веснавое сяўбы. Ён імкнецца дыскрэдытаваць у вачох сялянства мясцовыя партыйныя арганізацыі, прыпісваючы памылкі асобных галавацяпаў і злачынцаў усёй партыйнай арганізацыі.

І там, дзе перавод на новы статут праводзіцца вельмі марудна, там кулак робіць уплыў на пасобных сераднякоў. Там мы маем выпадкі сваёвольнага, анархічнага разбору калгаснікамі абагуленай малочнай жывёлы.

Супраціўленьне да пераводу калгасаў на новы статут, якое прыкрываецца часамі «левымі» фразамі, льле ваду на млын правага ўхілу, зьяўляецца фактычна ні чым іншым як выразным праяўленьнем правага ўхілу. Правы ўхілісты зацікаўлен у тым, каб замарудзіць узмацненьне калгаснага руху, каб на падставе асобных памылак, асобных перагібаў «даводзіць» немагчымасьць ажыцьцяўленьня генэральнай лініі партыі. Гэтым спробам партыя дасьць самы рашучы і рэзкі адпор. НОВЫ СТАТУТ ВЯДЗЕ НАС НЕ НАЗАД. А НАПЕРАД. Новы статут дае нам магчымасьць лягчэй зь ўсё і хутчэй зь ўсё замацаваць дасягнутае. Новы статут, ударяючы па памылках і скажэньнях, палягчае нам у дасягненьні новых посьпехаў, новых перамог.

Яшчэ раз мы павінны зьвярнуць увагу на недаацэнку работы сярод беднаты, якая мае месце ў некаторых раёнах, ня гледзячы на катэгарычныя паказаньні партыі. Перагібы ў адносінах да серадняка, адміністраваньне, прышыбеёўскія мэтады арганізацыі калгасаў ідуць разам, поплеч са злачынным забыцьцём арганізацый, значнымі работы сярод беднаты, умацаваньня батрацка-бядняцкіх арганізацый. І гэтаму выразнаму праяўленьню правага ўхілу партыйныя арганізацыі павінны даць руйнуючы адпор.

Нельга забывацца, што асноўнае, галоўнае ў сучасны момант—гэта найхутчэйшае абагуленьне асноўных сродкаў вытворчасьці, паказаных у статуце. Ня дробная жывёла, не непрадукцыйная малочная карова, а конь, прадукцыйная рабочая жывёла вырашаюць лёс сельска-гаспадарчай кампаніі. Не раскідацца, не хватацца за ўсё і забываць аб важнейшым.

Палітычна шкодную, праваапартуністычную па сутнасьці, робіць памылку ў радзе месц тыя, каторыя, замест таго, каб дабіцца 100-процантнага абагуленьня асноўных сродкаў вытворчасьці, прабуюць перасКочыць праз ступень, хто з-за аднае карэўкі, авечкі, або сьвіньні ідзе на абвастрэньне адносін з асноўнымі масамі вёскі, хто, ня ўлічаючы мясцовых умоў, прабуе абагуліць усе малочныя каровы.

«Дражніць селяніна - калгасьніка абагуленьнем жыльпёвых памяшканьняў, усяе малочнае жывёлы, усяе дробнае жывёлы, хатняй птушкі, калі арцельная форма калгасаў яшчэ не замацавана,—хіба-ж ня ясна, што такая «палітыка» можа быць пажаданай і выгаднай толькі нашым заклятым ворагам!» (Сталін).

Трэба цьвёрда праводзіць статут сельска-гаспадарчай арцелі. Там, дзе калектывізацыя праводзілася з перагібамі, з парушэньнем партыйнай лініі, дзе пры ажыцьцяўленьні калектывізацыі былі дапушчаны адміністраваньне і прымус, зусім бясспрачна, што частка сялян, членаў калектываў, на аснове статуту, пастановіць захаваць прыватную ўласнасьць на адну карову.

Там, дзе калгаснікі гэтага патрабуюць, трэба зьвярнуць у індывідуальнае карыстаньне неправільна абагуленую карову.

Успомнім словы тав. Сталіна:

«Сельска-гаспадарчая арцель зьяўляецца ў даны момант асноўным зьвяном сыстэмы калгаснага руху. З гэтага вынікаюць ажыцьцяўленьне важнейшых і адназьнейшых дырэктыў партыі, паказаных у апошнім артыкуле т. Сталіна. Спрова даходзіць да таго, што ў Крычаве былі выпадкі ўтойваньня ад сялян нумароў газэты з артыкулам тав. Сталіна.

«Зьвязда» ня раз падкрэсьлівала на сваіх старонках, што мясцовыя партыйныя арганізацыі павінны стаць на чале пераводу калгасаў на новы статут, узяць на сябе ініцыятыву і кіраўніцтва гэтай справай. Пайсьці ў масы, пайсьці ў калгасы, на батрацка-бядняцкія нарады, на агульныя сходы калгаснікаў тлумачыць, папупрызываць партыйныя дакументы. Расказваць масам сутнасьць артыкулу тав. Сталіна і новага статуту калгасаў. Увесьці ў арганізаванае рэчышча перавод на новы статут. Не дапускаць стыхійнасьці. Давяць рашучы адпор кулацкім вылазкам.

На жаль, у некаторых мясцох гэтага ня робіць і тым самым дзейнічаюць на руку кулаком. Клясавы вораг разгортвае шалёную агітацыю, ён прабуе сарваць калектывізацыю, сарваць падрыхтоўку да веснавое сяўбы. Ён імкнецца дыскрэдытаваць у вачох сялянства мясцовыя партыйныя арганізацыі, прыпісваючы памылкі асобных галавацяпаў і злачынцаў усёй партыйнай арганізацыі.

І там, дзе перавод на новы статут праводзіцца вельмі марудна, там кулак робіць уплыў на пасобных сераднякоў. Там мы маем выпадкі сваёвольнага, анархічнага разбору калгаснікамі абагуленай малочнай жывёлы.

Супраціўленьне да пераводу калгасаў на новы статут, якое прыкрываецца часамі «левымі» фразамі, льле ваду на млын правага ўхілу, зьяўляецца фактычна ні чым іншым як выразным праяўленьнем правага ўхілу. Правы ўхілісты зацікаўлен у тым, каб замарудзіць узмацненьне калгаснага руху, каб на падставе асобных памылак, асобных перагібаў «даводзіць» немагчымасьць ажыцьцяўленьня генэральнай лініі партыі. Гэтым спробам партыя дасьць самы рашучы і рэзкі адпор. НОВЫ СТАТУТ ВЯДЗЕ НАС НЕ НАЗАД. А НАПЕРАД. Новы статут дае нам магчымасьць лягчэй зь ўсё і хутчэй зь ўсё замацаваць дасягнутае. Новы статут, ударяючы па памылках і скажэньнях, палягчае нам у дасягненьні новых посьпехаў, новых перамог.

Яшчэ раз мы павінны зьвярнуць увагу на недаацэнку работы сярод беднаты, якая мае месце ў некаторых раёнах, ня гледзячы на катэгарычныя паказаньні партыі. Перагібы ў адносінах да серадняка, адміністраваньне, прышыбеёўскія мэтады арганізацыі калгасаў ідуць разам, поплеч са злачынным забыцьцём арганізацый, значнымі работы сярод беднаты, умацаваньня батрацка-бядняцкіх арганізацый. І гэтаму выразнаму праяўленьню правага ўхілу партыйныя арганізацыі павінны даць руйнуючы адпор.

Нельга забывацца, што асноўнае, галоўнае ў сучасны момант—гэта найхутчэйшае абагуленьне асноўных сродкаў вытворчасьці, паказаных у статуце. Ня дробная жывёла, не непрадукцыйная малочная карова, а конь, прадукцыйная рабочая жывёла вырашаюць лёс сельска-гаспадарчай кампаніі. Не раскідацца, не хватацца за ўсё і забываць аб важнейшым.

Палітычна шкодную, праваапартуністычную па сутнасьці, робіць памылку ў радзе месц тыя, каторыя, замест таго, каб дабіцца 100-процантнага абагуленьня асноўных сродкаў вытворчасьці, прабуюць перасКочыць праз ступень, хто з-за аднае карэўкі, авечкі, або сьвіньні ідзе на абвастрэньне адносін з асноўнымі масамі вёскі, хто, ня ўлічаючы мясцовых умоў, прабуе абагуліць усе малочныя каровы.

«Дражніць селяніна - калгасьніка абагуленьнем жыльпёвых памяшканьняў, усяе малочнае жывёлы, усяе дробнае жывёлы, хатняй птушкі, калі арцельная форма калгасаў яшчэ не замацавана,—хіба-ж ня ясна, што такая «палітыка» можа быць пажаданай і выгаднай толькі нашым заклятым ворагам!» (Сталін).

Трэба цьвёрда праводзіць статут сельска-гаспадарчай арцелі. Там, дзе калектывізацыя праводзілася з перагібамі, з парушэньнем партыйнай лініі, дзе пры ажыцьцяўленьні калектывізацыі былі дапушчаны адміністраваньне і прымус, зусім бясспрачна, што частка сялян, член

СПЫНІЦЬ ГРЫЗЬНЮ І СПРЭЧКІ

Будаўніцтва ў калгасах пад пагрозай

У нас у гэтым годзе вызначаецца вялікае будаўніцтва ў калгасах — розныя прамысловыя прадпрыемствы, усякія гаспадарчыя і жыльлёвыя будоўлі. Агульны кошт усяго будаўніцтва ў калгасах на гэты год вызначаецца прыблізна ў суме 40 мільёнаў руб., з іх больш паловы прыпадае на капітальнае будаўніцтва. Для забеспячэньня магчымасьці выкананьня такіх шырокіх будаўнічых плянаў у Беларусі была створана спэцыяльная праектна - будаўнічая арганізацыя — Калгасбуд. Гэта арганізацыя павінна займацца праектаваньнем і будаўніцтвам прамысловых прадпрыемстваў і найбольш буйных гаспадарчых і жыльлёвых пабудоў.

Зараз перад самым пачаткам будаўнічага сэзону на гэтым вучастку калгаснай работы выявіліся небясьпечныя хібы, якія, калі іх неадкладна не ліквідаваць, могуць сарваць нам будаўнічы сэзон. Пры гэтым віна тут падае ня толькі на новую будаўнічую арганізацыю — Калгасбуд, але і на Калгасцэнтр, Паляводсаюз, малочна - жывёлагадоўчы саюз і інш.

Небясьпека, перш за ўсё, заключаецца ў тым, што праз меру зацягваецца заключэньне дагавароў паміж Калгасбудам і арганізацыямі (Калгасцэнтр і спэцыяльныя саюзы) — нагадваюцца цяганіна, грызьня, спрэчкі — а праекты дагавароў ляжаць не падпісанымі. Праўда, Калгасцэнтр падпісаў, нарэшце (толькі гэтымі днямі), генэральны дагавор з Калгасбудам, але спэцыяльныя саюзы адмаўляюцца прыкласьці сваю руку да гэтага дагавору, знаходзячы некаторыя пункты для сябе няўжытнымі. нават кабальнымі. Такім чынам ня знойдзена агульная мова паміж савецкімі, гаспадарчымі і грамадзкімі арганізацыямі—гэта ганебны факт.

Калгасбуд упарта адмаўляецца ад многіх будаўнічых праектаў, спасылаючыся на свае слабыя сілы і паказваючы на тое, што такія праекты (буйныя малочныя і льняныя заводы) пад сілу толькі маскоўскім інжынэрна - тэхнічным сілам. Гэтыя довады зусім нясуразныя — калі Калгасбуд ня можа справіцца ўласнымі сіламі з тым ці іншым складаным аб'ектам, дык нехай ён сам зьвяжаецца з маскоўскімі праектоўшчыкамі.

Але ня менш винаваты і другі бок— будуючыя арганізацыі. Справа ў тым, што большая частка будаўніцтва ў калгасах (усякая перабудова, перанос будынкаў і дробнае новае гаспадарчае і жылое будаўніцтва) прыпадае на долю спэцыяльных саюзаў. А гэтыя апошнія парашылі — ёсьць-жа Калгасбуд, дык хай будзе, а нам чаго-ж турбавацца. Гэтае перакладаньне ўсёй работы, усёй адказнасьці на Калгасбуд — арганізацыю маладую, з вельмі абмежаванымі кадрамі інжынэраў і тэхнікаў — зьяўляецца зусім няправільным і ідзе ўразрэз з пастановаю Эканомнарады аб тым, каб арганізацыі і пасьлі стварэньня Калгасбуду не пасьлаблялі сваёй работы на будаўніцтве.

Не малая доля віны прыпадае і на Калгасцэнтр, які павінен быў з дапамогаю эканамістых і агранамаў (якіх няма ў Калгасбуду) распрацаваць эканамічныя ўгрунтаваньні на найбольш буйных будаўнічых аб'ектах, але ён гэтага не зрабіў. Але дзе-ж тут гаварыць аб эканамічных угрунтаваньнях, калі ў Калгасцэнтры яшчэ дагэтуль няма яснасьці і паўнасьці аб пунктах будаўніцтва — дзе іменна, у якім калгасе трэба будаваць той ці іншы будынак.

Цяпер аб агра - індустрыяльных камбінатах (Рагачоўска - Жлобінскім і Ляднянска - Дубровенскім). Яшчэ на сёнешні дзень у Калгасцэнтры адсутнічаюць арганізацыйныя пляны па гэтых камбінатах, а бяз гэтага цяжка гаварыць аб праектах будаўніцтва. Ёсьць толькі некаторыя разьлікі, некаторыя намячэньні, якія ня могуць быць пакладзены ў аснову для складаньня праектаў і каштарысаў і плянаў будаўнічых работ. З прычыны такога пагражаючага становішча Наркамзем зараз вылучыў спэцыяльную групу (у складзе спэцыялістых Дзяржпляну, ВСНГ, Аўтатранспарту і г. д.). якая ва ўдарным парадку павінна правесьці работу па складаньні арганізацыйных плянаў на абодвых камбінатах.

Зараз перад пачаткам будаўнічага сэзону, калі шмат каштоўнага часу ўжо патрачана, трэба кінуць усякія дыскусіі, усякую грызьню і кручкатворства, трэба энэргічна ўзяцца за работу кожнаму па сваёй лініі і агульнымі намаганьнямі забясьпечыць посьпех будаўніцтва ў калгасах. Справа гэта надзвычайна складаная і сур'ёзная — і кожная арганізацыя ў разуменьні тэй вялікай адказнасьці, якая на яе ўскладаецца, павінна ўсімі мерамі і магчымасьцямі дапамагаць посьпеху агульнай справы.

Л. Н—даў.

Практыка студэнтаў...на апошнім месцы

Апошні пленум ЦК УсеКП(б) даў зусім ясныя дырэктывы ад падрыхтоўцы тэхнічных кадраў. Гэтыя дырэктывы неабходна ведаць і выконваць ня толькі навучальным установам, але і ўсім, хто мае дачыненьне да падрыхтоўкі спэцыялістых. На справе-ж у некаторых мясцох абстаіць зусім інакш.

Вось некаторыя факты з жыцьця віцебскіх палітэхнікумцаў. Прышоў студэнт-практыкант на віцебскую панчошна-трыкатажную фабрыку. Зьявіўся да кіраўніка фабрыкі.

— Вы студэнт? Прышлі на нашае прадпрыемства адбываць бесьперапынную практыку? Ну, добра, добра! Зараз я вам дам работу.

Потым паставіў ля панчошнай машыны і кажа:

— Калі вы хочаце быць добрым спэцыялістым, дык павінны вывучыць усе працэсы нашае вытворчасьці.

Так студэнт і працаваў каля трох тыдняў на жаночых панчохах.

Прышоўшы на практыку, студэнты ня ведаюць, што ім рабіць, як пачынаць практыку, туляюцца з кута ў кут. Адміністрацыя прадпрыемства зусім не зварачае на гэта ўвагі. Прышоў студэнт на прадпрыемства, значыць трэба спісаць у выдатак грошы, якія прыдзецца заплаціць студэнту. Вось і ўсё кіраўніцтва.

Ня менш стаіць гэта справа і ў трэстах. Тут заўважваюцца імкненьні да таго, каб як мага менш пасылаць практыкантаў на іх прадпрыемствы. Ёсьць нават такія факты, калі прадпрыемства згаджаецца ўзяць студэнта на практыку, а трэст супярэчыць. Такое-ж становішча з кіраўніцтвам практыкай студэнтаў і з боку ВСНГБ. Апошні і дагэтуль ня даў прадпрыемствам і трэстам дакладных дырэктыў па гэтых пытаньнях. Расклад месц для практыкантаў ВСНГБ пасылаў са спазьненьнем, што не давала магчымасьці навучальнай установе кіраваць практыкай.

Усе гэтыя факты і недарэчнасьці маюць месца ў той час, калі студэнт на практыцы павінен ня толькі бачыць прадпрыемства, але і ўмець у ім працаваць, а скончыўшы курс навучаньня кіраваць гэтым прадпрыемствам; калі свамі паводзінамі і адносінамі да вытворчасьці ён павінен даваць прыклад больш культурна адсталым рабочым, калі на палставе дасягненьняў навукі і тэхнікі павінен рацыяналізаваць прадпрыемства.

Праўда, ня трэба заплюшчваць вачэй і на такое зьявішча, калі многія студэнты лічаць сябе вельмі адукаванымі, каб працаваць на прадпрыемствах Беларусі: «нам ужо няма чаго там рабіць, пасылайце нас на Волхаўбуд, Дняпрабуд і г. д.». І таму заўважваюцца нядбайныя адносіны да практыкі. З такімі настроямі трэба весьці рашучую барацьбу.

Трэба тэрмінова праграму практыкі студэнтаў абгаварыць на прадпрыемствах з высокакваліфікаванымі рабочымі і адміністрацыйна-тэхнічным складам.

Прыцягваць да кіраўніцтва практыкай высокакваліфікаваных рабочых, адміністратараў-практыкаў. Ад ІТС патрабаваць, каб яны часьцей абмяркоўвалі і заслухоўвалі справаздачы асоб, адказных за практыку студэнтаў. З боку адпаведных кіраўнічых органаў неабходна выданьне загаду аб практыцы, сыстэматычная праверка выкананьня гэтых загадаў. На мясцох трэба прапрацаваць пытаньне аб матар'яльнай узнагародзе кіраўнікоў практыкі, павесьці рашучую барацьбу са студэнтамі, якія нядбайна адносяцца да практыкі.

І самае галоўнае — трэба мабілізаваць вакол гэтай справы ўсю грамадзкасьць, часьцей абгаворваць пытаньні практыкі студэнтаў на ПС, ПК, на сходах рабочых. Больш шырока, рашуча папулярызаваць і выконваць пастановы лістападаўскага пленуму УсеКП(б) аб падрыхтоўцы кадраў.

ДРУЖАЛОЎСКІ.

16 сакавіка, а 10 гадз. раніцы, у памяшканьні райкому КП(б)Б м-ка **КРЫЧАУ** склікаецца рэдакцыямі газэт «Зьвязда» і «Камунар Магілеўшчыны» сумесна з Крычаўскім райкомам КП(б)Б

РАЁННАЯ НАРАДА СЕЛЬКОРАЎ Крычаўскага раёну, Магілеўскай акругі

ПАРАДАК ДНЯ: 1. Задачы селькораў у раёне сацыяльнай калектывізацыі.
2. Аб арганізацыі насьценных газэт пры калгасах.

На нараду павінны зьявіцца рэдактары насьценгазэт, усе рабкоры, селькоры і сьценкоры. Запрашаюцца калгаснікі.

МЕНСК

2 мільёны рублёў на дапамогу батраком-калгаснікам

Пры Белсельбанку ствараецца фонд у разьмеры 2 мільёнаў рублёў на кароткатэрміновае крэдытаваньне калгасаў для аплаты батракоў - калгаснікаў.

Прэзыдыум Беларускага камітэту саюзу сельгаслесрабочых прызнаў патрэбным, каб на сакавік і красавік калгасам было выдана на гэту мэту ня менш 500 тысяч рублёў. Крэдыт выдаецца калгасам у якасьці бяспроцантнай пазыкі тэрмінам да 1 году. Крэдытаваньне будзе праводзіцца выходзячы з ліку батракоў у даным калгасе і з разьліку ня менш, як 12 рублёў у сярэднім на кожнага батрака ў месяц.

Для разьмеркаваньня крэдытаў на зарплату батраком - калгаснікам паміж паасобнымі калгасамі пры РВК ствараюцца спэцыяльныя камісіі.

Саюз сельгаслесрабочых ставіць пытаньне перад камітэтамі сялянскай узаемадапамогі і калгасцэнтрахам аб асьцярожаньні 152 тыс. рублёў для аказаньня адначасовай матар'яльнай дапамогі бядняцкай частцы батракоў - калгаснікаў. Гэтыя сродкі павінны быць разьмеркаваны па паасобных калгасах, выходзячы з сярэдняй выплаты дапамогі батраком: сямейным ня звыш 15-20 руб. і адзінокім—8-12 рублёў.

Саюз сельгаслесрабочых зьвярнуў увагу Наркамгандлю на патрэбу ўзьмацьненьня з яго боку тэрміновых мер да забесьпячэньня батракоў - калгаснікаў хлебам і іншымі прадуктамі і таварамі шырокага спажываньня.

Забесьпячэньне Менску малаком

Акргандаль абгаворваў пытаньне аб забесьпячэньні Менску і Барысава малаком. Пры патрэбнасьці Менску ў 35.000 літрах на дзень да 1-га сакавіка штодзённа фактычна завозілася ня больш 6.500 літраў. Толькі ў апошнія дні ўдалося давесьці завоз да 9.000 літраў, што дае магчымасьць выдаваць малако ня толькі дзецям да 5 год, але і да 9-ці год.

Заданьне аб кантрактацыі малака да 15-га лютага Акрмалжывсаюз ня выканаў. Замест вызначаных 12.700 тон заключаны дагаворы ўсяго на 7.000 тон, што складае 56 проц. Некаторыя калгасы зусім адмаўляюцца заключыць дагаворы на дастаўку малака.

Укамплектаваньне малочных фэрм вакол Менску яшчэ ня скончана. Белсельтрэсту запранапавана ў тэрміновым парадку перакінуць у прыгарадныя саўгасы тысячы галоў малочнае жывёлы з саўгасаў, якія знаходзяцца на вялікай адлегласьці.

Ліквідаваць няпісьменнасьць у 1930-31 годзе

Калегія Наркамасьветы БССР зацьвердзіла плян ліквідацыі няпісьменнасьці сярод працоўных Беларусі. Паводле пляну няпісьменнасьць сярод членаў прафсаюзаў ва ўзросьце да 50 год і іншых працоўных да 45 год павінна быць ліквідавана ў 1930-31 годзе.

Тэрмін навучаньня на лікпунктах устаноўлены—1 год, у школах малапісьменных—2 гады, з тым, каб па аканчэньні лікпункту і школы малапісьменных, вучні атрымалі б веды ў абёме чатырохгодкі.

Ад камісіі па чыстцы апарату Лесбелу

Камісія па чыстцы апарату трэсту «Лесбел» просіць установы, якія маюць сувязь у сваёй рабоце з апаратам Лесбелу, а таксама і ўсіх працоўных падаваць свае канкрэтныя заўвагі наконт недахопаў у рабоце апарату трэсту, уносіць прапановы па паляпшэньні работы апошняга і паведамляць кампрамэтуючы матар'ял на паасобных працаўнікоў Лесбелу.

Матар'ялы накіроўваць НК-РСІ Беларусі — цэнтральнай камісіі па чыстцы савецкага апарату.

Рабочыя на адказную працу

Сакратарыят ЦВК БССР пастанавіў выпучыць на пастаянную работу ў ЦВК работніцу віцебскай фабрыкі імя Клары Цэткін, тав. Аляніцкую—намесьнікам загадчыка прыёмнай прэзыдыуму ЦВК, тав. Махліну (работніца гэтай-жа фабрыкі)—адказным інструктарам цэнтральнай дзіцячай камісіі і тав. Ходзькіна—рабочага Добрускай фабрыкі «Гэрой Працы»—інструктарам арганізацыйна-інструктарскага аддзелу прэзыдыуму ЦВК БССР.

5-ЦІГОДКА БЕЛАРУСКАГА МАСТАЦТВА

МУЗЫЧНАЯ ОПЭРА Ў МЕНСКУ

Плянавая камісія Наркамасьветы зацьвердзіла праект 5-цігодкі па лініі Галоўмастацтва БССР.

Паводле праекту ў Беларусі на працягу 5-цігодкі павінны быць арганізаваны яшчэ 4 беларускія вандроўныя дзяржаўныя тэатры для абслугоўваньня раёнаў, беларускі рабочы вандроўны тэатр, тэатр рабочай моладзі і тэатры «юнага гледача», з лялькавым тэатрам для дашкольнікаў.

У 1932-33 годзе ў Менску пачне сваю работу беларуская дзяржаўная музыкальная (опэра). Для гэтай мэты з восені 1930 году опэрная студыя пачне падрыхтоўку музыкальна - вакальных сіл і рэпэртуару.

Для падрыхтоўкі мастацкіх кадраў вызначана арганізацыя з восені 1930 году ў Менску тэхнікуму сцэнічнага мастацтва з рознымі кароткатэрміновымі курсамі пры ім.

У галіне музыкі арганізуюцца — ансамбль народных інструмантаў у 10 асоб і два струнныя квартэты.

Сыстэма музычнай асьветы рэарганізуецца на новых падставах. У кожнай акрузе выдучацца адна сямігодка, якой налаецца музычны ўхіл.

Пяцігодкай прадбачыцца пабудова новых тэатральных будынкаў у Менску, Бабруйску, Воршы, Полацку, Мазыры, Гомелі.

У Барысаве пачнецца пабудова ўзорнага рабочага тэатру, а ў Менску—цырку. Апрача таго, у Менску пачнецца пабудова будынку мастацкага тэхнікуму і кансэрваторыі.

ШКОДНІЦТВА НА ХЛЕБАЗАВОДЗЕ

ГАНЯЮЦЦА ЗА КОЛЬКАСЬЦЮ І ЗАБЫВАЮЦЬ ПРА ЯКАСЬЦЬ

У «Зьвязьдзе» пісалася ўжо аб тым, што на хлебазавод праелезьлі шкодніцкія і кулацкія элемэнты. У выніку гэтага бывалі выпадкі, калі ў цеста заганяліся цьвікі, кускі іржавага жалеза, падкоў і г. д. Такімі злачынствамі кулацкія і шкодніцкія элемэнты прабуюць дыскрэдытаваць нашае будаўніцтва ў вачох працоўных.

Мы павінны канстатаваць, што на хлебазаводзе ня робіцца ўсяго для таго, каб выкрыць і выкінуць гэтых шкоднікаў з асяродзішча рабочых.

На хлебазаводзе ёсьць шмат новых рабочых, якія прыбылі з вёскі і маюць там сваю ўласную гаспадарку. Ёсьць таксама і такія рабочыя, якія нядаўна зачынілі свае ўласныя саматужныя хлебапякарні.

Сярод гэтых новых пластоў рабочых хлебазаводу не вядзецца ніякай выхаваўчай работы.

Хлебазавод абвясьціў сябе ўдарным, але праца на ім праводзіцца зусім не па-ўдарнаму. Ганяюцца за колькасьцю, а пры гэтым пагоршваецца якасьць выпечкі хлеба.

З гігіенай на заводзе справа зусім дрэнная. Спэцвопратка брудная, рукі ў рабочых, асабліва ў бараначным цэху, нячыстыя.

З працдысцыплінаю на заводзе таксама нядобра. Ёсьць значны процант прагулаў, непадпарадкаваньняў рабочых загадам майстроў. Выў, напрыклад, такі факты, калі майстар сказаў адной работніцы, кандыдату партыі, тав. Ась, каб яна лепш адносілася да работы. На гэта яна адказала: «напляваць мне на майстра і адміністрацыю, у мяне ячэйка і заўком гаспадар». Падобных прыкладаў на заводзе вельмі многа.

Рабочыя хлебазаводу пад кіраўніцтвам заўкому і партыйнай ячэйкі павінны выправіць гэтыя недахопы і павесьці рашучую барацьбу са шкодніцтвам.

А. МАНЬКОЎ.

ЗА ДЗЕНЬ

◆ МЦРК пачаў выдаваць пайшчыкам цукер за красавік месяц па ранейшых нормах. На дзіцячыя кніжкі будзе выдаваць па 500 грам цукру.

Утрыманцы саматужнікаў вытворчых арцеляй атрымаюць цукер па 3-й катэгорыі—250 грам на едака.

◆ З заўтрашняга дня МЦРК пачне выдаваць з магазыну № 17 сукно тым пайшчыкам, якія атрымалі талёны да 10-га сьнежня. Сукно па гэтых талёнах будзе выдавацца толькі да 1-га красавіка.

◆ 17-га сакавіка адбудзецца датэрміновы выпуск прававога аддзяленьня праўгасу БДУ.

Беларускі палітасьветны тэхнікум

Згодна пастановы калегіі Наркамасьветы, Магілеўскі палітасьветны тэхнікум анача пашырае сваю работу. Тэхнікум будзе рыхтаваць працаўнікоў па наступных галінах: масава-палітасьветнай, школьна-курсавой, бібліятэчнай і па кіно-радыё. У 1930-31 годзе вызначаны прыём у 300 чалавек, з якіх на масава-палітасьветнае аддзяленьне—125 чалавек, школьна-курсавое—75, бібліятэчнае—60, па кіно-радыё—40.

На беларускі сэктар будзе прынята 235 чалавек, яўрэйскі—35, польскі—30.

Ганьбім грабежніцкую ролю папы і капіталістых

3-га сакавіка, у дзень рэлігійнага татарскага сьвята «Байрама» быў склікаены аб'яднаны сход татар: членаў татарскага гароднага калгасу «Чырвоны Гароднік» і ячэйкі вайўнічых бязбожнікаў. Былі заслуханы даклады аб «крыжавым паходзе на СССР» і аб дзейнасьці ячэйкі вайўнічых бязбожнікаў. На сходзе прымала ўдзел больш за 100 чал.

У рэзалюцыі сход аганьбіў грабежніцкую ролю папы і капіталістых, якія пад шыльдай рэлігійнасьці прабавалі распаліць вайну супроць СССР, каб сарваць сацыялістычнае будаўніцтва дзяржавы прапоўных, а членаў калгасу і ячэйкі заклікае да ўзмоцненай вярбоўкі новых членаў у ячэйку вайўнічых бязбожнікаў.

Якое будзе надвор'е ў сакавіку

Паводле даных Белгеафізу, да 16-га сакавіка па БССР магчыма чакаць няўстойлівага надвор'я. Ад 16-га да 19-га сакавіка прадбачыцца адліга з парывістымі вятрамі. З 19-га да 23 сакавіка магчыма пахаладаньне пры паравальна ціхім надвор'і.

Да канца сакавіка прадбачыцца надзвычай няўстойлівае надвор'е з парывістымі вятрамі. Пачынаючы ад 7-га красавіка, чакаецца шпаркае раставаньне сьнегу.

Кулак зьбіў актывістку-бяднячку

Тое, што адбылася з Навіцкай—актыўнай грамадзкай працаўніцай вёскі Воснава, Вушацкага раёну, надзвычай выразна малюе тую жорсткую клясавую барацьбу, якую вядуць у вёсцы масы бядняцтва, батрачак, калгаснік, серадняцтва.

Навіцкая—адна з тых арганізатараў работы па ліквідацыі няпісьменнасьці, якая (работа) зараз шырока разгарнулася па М. Донецкім сельсавеце. У вёсцы Воснаве школу няпісьменнасьці наведвае 50 чал., у тым ліку нават 50-60-гадовыя асобы. У гэтай справе ёсьць і частка работы Навіцкай. У часе правядзеньня збожжазагатоўчай кампаніі мінулага году Навіцкая выкрыла шмат кулакоў, якія ўхіляліся ад здачы збожжа дзяржаве.

Сваю вялікую грамадзкую працу ў сельсавеце яна праводзіла, ня гледзячы на перашкоды з боку мужа, які ўсімі сіламі імкнуўся сарваць ле з грамадзкай работы.

Навіцкая сама няпісьменная. У канцы студзеня яна пайшла на заняткі ў школу няпісьменных. Школа якраз зьмянчалася ў хаце кулака Паўлючэнкі, у якога яна выкрыла ліпкі збожжа ў часе загатовак. Кулак прыпомніў нанесеную крыўду і, уцягнуўшы ў хату, зьбіў Навіцкую, нарваў на ёй усю вопратку, выкінуў зьбітую на сьнег у канаву. Беднякі, якія наведвалі школу, былі абураны такімі наглымі ўчынкамі кулака. Яны паведамілі аб гэтым здарэньні ў вушацкую міліцыю.

Але прадстаўнік міліцыі зьявіўся ў вёску толькі праз тры дні і ня прыняў рашучых мер у адносінах абнагледлага кулака.

Раённыя органы недаацанілі палітычнай сутнасьці данай справы.

Трэба рашуча ўдарыць па клясавым ворагу, які імкнецца сарваць мерапрыемствы, што праводзіць савецкая ўлада. Трэба, каб кулак Паўлючэнка быў жорстка пакараны савецкім судом.

ФРОЛАЎ.

Ідзе новы ўдзельнік сацбудаўніцтва жонка рабочага

ЖАКТ № 3 пазаўчора арганізаваў вечар, прысьвечаны Міжнароднаму Жаночаму Дню—8-га сакавіка. На сход зьявіліся ўсе жонкі рабочых і служачых і нават самі рабочыя і служачыя.

Тое, што адбылося на сходзе, зрабілі вялікае ўражаньне на ўсіх прысутных. Праўленьне ЖАКТ'У вылучыла на кароткатэрміновыя курсы кулінараў жонку рабочага-маляра т. Кацман, жонку грузчыка, грамадзкую працаўніцу ЖАКТ'у т. Гэршанзон Рэю, дэлегатку, жонку шаўца—т. Бурэц; на кароткатэрміновыя курсы дашкольных работніц—т. т. Каган, Шаркоўскую; на практыку па дзіцячых садох—т. т. Столяр і Цыпецкую. Усе яны пасьля сканчэньня курсаў будуць пасланы на работу ва ўстановы і прадпрыемствы.

Акрамя таго, сход абраў таварыскі суд у складзе 8-мі асоб, з якіх 4 хатнія гаспадыні.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

14 сакавіка г. г., а 6 гадз. увеч., у памяшканьні акругкому партыі (заля пасяджэньняў) склікаецца нарада па пытаньні партпалітвучобы Барысаўскага, Кастрычніцкага і Фрунзаўскага РК.

На нараду запрашаюцца: апоргі партыйных ячэек: Меншвэю, «Камунар», 1-й друкарні, БДВ, Эльводу, «Дрэваапрацоўшчык», Гандальбуду, галянтарэйнай ф-кі, Белдзяржбуду, хлебазаводу, вагонных майстэрань, малага рамонту, «Энэргіі», «Бальшавік», абутковае ф-кі, ДЭПО, ЦРК-3 і па Барысаўскім РК—«Чырвоная Бярэзіна», «Домбаль», «Камінтэрн». Таксама запрашаюцца загадчыкі і інструктары ВСПШ, АПШ, заг. АПА РК КСМ і пэрсанальна т. т. Аўчыньнікаў, Гарбатаў, Любін, Орліс, Модэль, Пятушкоў, Левіна, Шавель, Рубэнчык (АК КСМ), Скабло і Нікіцін.

— 15-га сакавіка, у 19 гадз., адбудзе агульны сход супрацоўнікаў Наркамгандлю ў памяшканьні Белдзяржгандлю (Пляц Волі, 7).

Парадак дня:

1. Даклад старшыні камісіі на чыстцы і праверцы апарату Наркамгандлю.
2. Даклад аб становішчы працы і недахопах у апараце Наркамгандлю. На сход запрашаюцца супрацоўнікі НКГ, рабочыя фабрыкі «Кастрычнік», і кіраўнікі: Белмясгандлю, Белдзяржгандлю, Паляводсаюзу, Малжыгсаюзу і ЦП саюзу саўгандальслужачых.

— 23-га сакавіка г. г. у нядзелю, а 10 гадз. раніцы пры Пухавіцкім РК КП(б)Б адбудзецца шырокая нарада рабкораў, селькораў, насьценкораў і рэдкалегій насьценгазэт.

Будуць абгаворваны пытаньні:

1. Аб калектывізацыі, наступнай кампаніі і задачы друку.
2. Вынкі перавыбараў рэдкалегій насьценгазэт.
3. Аб выпуску шматтыражнай (друкаванай) раённай газэты і ўдзел у газэце рабселькораў.

РК КП(б)Б просіць усіх таварышоў зьявіцца без спазьненьня.

Заг. АПА РК КП(б)Б КАРУНЧЫКАЎ.

— ПК ЦК КП(б)Б паведамляе, што 23 сакавіка г. г. у 18½ гадз. будуць разглядацца справы наступных т. т.: Вяжэвіча Уладзімера Іванавіча, Гімельштэйн Рэвэкі Эдзідаўны, Карпінчыка Тодара Іванавіча, Гурло Міколы Васільлевіча, Усьціна Пракопа Зьмігравіча, Шабуня Анісіма Максімавіча, Шагалава Файвіша Лейбавіча, Аніфатар Енты Якубаўны, Кастрычыкага Алеся Паўлавіча, Муравіцкага Апанаса Сідаравіча, Караваткага Язэпа Мікітавіча, Аглушэвіча Пятра Канстанцінавіча, Шарубіна Іхана Язэпавіча, Гінзбурга Гейса Пэйсахавіча, Сьвірыдовіча Міколы Рыгоравіча, Пупэйкі Міколы Базыльлавіча, Гвазьдзёва Паўлы Мікітавіча, Сідарэнка Пётра Ігнатавіча, Якімчыка Вінцэся Андрэевіча.

Памянёныя таварышы запрашаюцца для ўдзелу пры разглядзе іх спраў. Праезд за свой кошт.

Таксама запрашаюцца старшыні праверкомаў, якія праводзілі іх чыстку, і сакратары ячэек, дзе яны лічацца на вучоце і знаходзяцца ў Менску.

Сакратар ПК ЦК КП(б)Б ЛЯЎКОЎ.

— На 15 і 16 сакавіка г.г. катэдра антрапалёгіі Беларускай Акадэміі Навук склікае антрапалёгічную канфэрэнцыю, на якую запрашае ўрачоў, пэдагогаў, пэдалёгаў г. Менску, якія працуюць па антрапаметрыі, а таксама і ўсіх зацікаўленых у гэтай галіне.

Парадак дня:

1. Даклады з месц.
2. Даклад аб працы катэдры антрапалёгіі БАН.
3. Дэманстрацыя мэтодыкі памераў.
4. Арганізацыйныя пытаньні па ўтварэньні сувязі з працаўнікамі.

Пачатак а 12 гадзіне дня ў залі ВАН, рог Універсытэцкай і Ленінскай вул., д. № 29/35.

СЁНЬНЯ

— Дэлегацкі сход першай групы пры Кастрыч. РК адбудзецца сёньня, у 19 гадз. у памяшканьні РК КП(б)Б.

— **Саюз мэдсанпрацы.** А 19 гадз. у клюбе мэдсанпрацы адбудзецца нарада прафактыву саюзу. Павестка дня: аб арганізацыі прафактыву і добраахвотніцтве (дакл. заг. арг. інстр. сэктару ЦСПСБ — т. **Каподка**). Яўка для членаў ЦПС, ГК, МК, усіх камісій абавязкова. Запрашаюцца члены саюзу.

— **Пэдгабінэт.** У 19 гадз. сэкцыя грамадзка - карыснае працы. Даклад 9-ці годкі МБВ чыг. — сацспаборніцтва ў правядзеньні грамадзка - карыснае працы.

ЗАЎТРА

— **Пэдгабінэт.** У 19 гадз.—канферэнцыя выкладчыкаў па вазнізацыі фізвыху. На парадку дня — абгаварэньне мэтадаў працы і ўвязка іх з іншымі дысцыплінамі.

— **Клюб навуковых працаўнікоў.** Агульны сход навуковых працаўнікоў з наступным паралкам дня: даклад тав. **Вальфсона** аб усесаюзным пленуме СНП і даклад тав. **Выдры** аб усесаюзнай культнарадзе. Пач. у 19 гадз.

— **Дом Камасьветы.** 16 сакавіка мастацкі раніцнік для партыйнага і камсамольскага актыву ў 12 гадз. У праграме сімфанічны канцэрт з удзелам салістага опэры **М. Кукліна.** Білеты — у чытальні Дому штодня з 10 гадз. раніцы да 10 гадз. вечары.

Адказны рэдактар Ян. АСЬМОЎ.

Да ведама падпісчыкаў „Зьвязды"

З сёньняшнім нумарам газэты „Зьвязда" рассылаецца дармовы дадатак— ГАЗЭТА „ПРАФРУХ" № 2

Падпісчыкі! Пры атрыманьні «Зьвязды» патрабуйце дадатак „ПРАФРУХ"

Сёньня, 14 сакавіка а 7-й гадзіне ўвечары ў клюбе харчавікоў (Школьная № 1) склікаецца

нарада прафактыву саюзу харчавікоў

У парадку дня: даклад ЦСПСБ аб вынніках арганарады аб рэарганізацыі саюзнага апарату.

Яўка старшынь ФЗМК і прафактыва абавязкова.

20-га сакавіка, а 10-й гадзіне раніцы, у памяшканьні рабочага клюбу г. Лепеля, Полацкай акругі, склікаецца рэдакцыямі газ. «Зьвязда» і «Чырвоная Полаччына» сумесна з Лепельскім райкомам КП(б)Б

раённая нарада рабселькораў Лепельскага раёну.

ПАРАДАК ДНЯ:

1. Калектывізацыя раёну і задачы селькораў.
2. Аб арганізацыі насьценгазэт пры калгасах.

На нараду павінны зьявіцца члены рэдкалегій насьценгазэт, селькоры, рабкоры і сьценкоры. Запрашаюцца калгаснікі.

ТЭАТР і КІНО

Дзяржаўны Яўрэйскі Тэатр БССР

АПОШНІЯ Пятніца, 14 сакавіка для саюзу саўгандальслужачых. Білеты ў саюзе і ў касе тэатру.

С. ГОДЫНЭР. ДЖЫМ КУПЭРКОЎ Пачатак а 8 гадз. 30 м.

КІНО «Інтэрнацыянал» Замежны мастацкі фільм **ЧАЛАВЕК АГНЮ** Пачатак 1 сэансу а 7 гадзіне. Каса—ад 5 гадзін.

КІНО «Пралетарый» Мастацкі фільм вытворч. «Арменкіно» **НЯВОЛЬНІЦА** драма 6 част. Пачатак 1-га сэансу а 7 гадз. увеч. Каса адчынена ад 5 гадз.

1-шы дзіцячы кіно-тэатр «Юны Піянэр» МАСТАЦКІ ХРАНІКАЛЬНЫ ФІЛЬМ **УПАД ДЫНАСТЫІ РАМАНАВЫХ** у 7 частках. ШТОДЗЕННА 2 СЭАНСЫ. Пачатак 1-га сэансу а 2 г., 2-га—3 г. 30 м. Каса адчынена а 12 гадз.

КІНО «Спартак» З панядзелка, 10 сакавіка БАЯВІКІ **КНЯЖНА МЭРЫ** паводле раману Лермантава. Драма ў 8 частках. Пачатак 1 сэансу а 7 гадз. Каса—ад 5 гадз. 30 м.

Інстытут аховы працы пры Наркампрацы БССР просіць усіх старых страхавікоў, якія працуюць і якія раней працавалі на тэрыторыі Беларусі да і пасьля рэвалюцыйнага часу ў галіне сацыяльнага страхаваньня (страхкасы, сабес, бальнічныя касы, страхавыя таварыствы і г. д.) **прысылаць у інстытут свой адрас.** Інстытут набывае старую страхавую літаратуру.

АДРАС ІН-ТУ: Менск, рог. вул. Карла Маркса і Энгельса 44-23. Нам. Старшыні Камісіі па Выкуч. Пётар. Сац. Страх. БССР Дырэктар Ін-ту Аховы Працы **ДЗІХЦЯР.**

Кіно-тэатр „КУЛЬТУРА" Толькі 3 дні. Ад пятніцы, 14 сакавіка Толькі 3 дні.

2 КАРЦІНЫ 2 у адзін сэанс

1. **Вароты Каўказу** (Войскова-Грузінская чыгунка) Падарожныя нататкі ў 6 частках.

2. **Гарольд Лёйд** у новай камэдыі **ДЗЕЛЯ ЧАРОЎНЫХ ВАЧЭЙ** у 3 частках.

Зьвыш праграмы гастроль **ТЭРМЭН-ВОКС.**

Пачатак а 7 гадз. Каса—ад 5 гадз.

Ад Народнага Камісарыяту Фінансаў БССР Даводзіцца да агульнага ведама, што:

6-ты ТЫРАЖ ВЫЙГРЫШАЎ па 3-яй СЯЛЯНСКАЙ ПАЗЫЦЫ 1927 году адбудзецца 15 сакавіка г. г. у гор. Маскве. У тыражы будзе разыграна 75.161 выйгрыш на агульную суму 875.000 руб.

4-ты ТЫРАЖ ВЫЙГРЫШАЎ па ДЗЯРЖ. ВЫЙГРЫШ. ПАЗЫЦЫ 1929 г. адбудзецца 16 сакавіка г. г. у гор. Маскве. У тыражы будзе разыграна 5.600 выйгрышаў на агульную суму 1.053.100 руб.

6-ты ТЫРАЖ ВЫЙГРЫШАЎ ПА 2-й ПАЗЫЦЫ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ. адбудзецца 20-22 сакавіка г. г. у гор. Сормаве. У тыражы ўдзельнічаюць усе аблігацыі процантна-выйгрышнага і бяспроцантна-выйгрышнага выпуску, за выключэньнем выйграўшых у першых пяці тыражах. Па абодвых выпусках будзе разыграна 108.600 выйгрышаў на агульную суму 11.677.200 р.

Афіцыйныя табліцы выйгрышаў будуць надрукаваны ў газэце «Известия ЦИК СССР и ВЦИК».

Для здачы **АБВЕСТКІ** у газэту **„ЗЬВЯЗДА"** званіце па тэл. **7-81**

У ВЫПАДКУ НЕАКУРАТНАЙ даставкі газэты **„ЗЬВЯЗДА"** званіце па тэл. **2-49**

Пастановай Савету Працы і Абароны на **„САЮЗХЛЕБ"** УСКЛАДЗЕНЫ **ВУЧОТ І РАЗЬМЕРКАВАНЬНЕ ТАРЫ**

Прапануецца ўсім дзяржаўным і кааперацыйным арганізацыям у працягу сакавіка месяца ЗАРЭГІСТРАВАЦЬ усю колькасьць, якая маецца ў наяўнасьці мяхоў, кулей і брэзэнтаў.

Рэгістрацыі падлягаюць мяхі як занятыя прадуктамі, так і вольныя. Рэгістрацыя вытвараецца ўсімі акруговымі аддз